№ 17 (375) 7 траўня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

19 траўня 19.00 клюб "РЭАКТАР"
СТАРЫ ОЛЬСА
вялікі канцэрт гурту "Стары Ольса"
прэзэнтацыя альбому "Ладзьдзя роспачы"
сярэднявечная дыскатэка
апошні канцэрт сэзону
даведкі і замовы квіткоў:
6490888, 7662425, 4006774

## Скуль той чорны пісталет?



Некаторыя падрабязнасьці арышту Марыніча.

старонка 6

## Першамайскі бунт

Прадпрымальніцкія лідэры Горадні: тры тактыкі.

старонкі 8–9

## Першая і апошняя імпэрыя

Салязар адмаўляў і шматпартыйнасьць, і прынцып партыі-дзяржавы. На яго думку, яны аднолькава садзейнічаюць уплыву масаў на палітыку, у той час як апошняя павінна быць манаполіяй эліты, стварыць якую «важней, чым навучыць усіх чытаць». Гісторыя Партугаліі —

старонка 12

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## 12+1 у Мазыры, Магілёве

**10 траўня** (пн) на філфаку Мазырскага пэду — літаратурнае кабарэ. Такую форму абралі арганізатары для творчай сустрэчы зь пераможцамі конкурсу маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай. Пачатак а 13-й. Вядуць спатканьне Ганна Кісьліцына й Андрэй Хадановіч. Даведкі праз т. 29-831.

**13 траўня** (чц) маладыя літаратары перабяруцца ў Магілёў, дзе спатканьні адбудуцца ва ўнівэрсытэце а 12.40 (даведкі на беларускай катэдры), а таксама ў «Коле сяброў».

## Конкурс для падпісчыкаў

«Наша Ніва» абвяшчае конкурс для падпісчыкаў. Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры. Каб узяць удзел у конкурсе, дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі.

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта нашмат таньней, чым уразdroб.

Дык падпісвайся!

# Алесь Міхалевіч



**7 траўня выходзіць на волю намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч, які адседзеў 10 сутак арышту за «Чарнобыльскі шлях». Каб выказаць павагу да палітыка, у сераду яго ў турме наведаў кіраўнік дыпмісіі Чэхіі ў Беларусі Ўладзімер Румл. У пятніцу а 8.30 на Акрэсьціна палітыка зьбіраюцца сустракаць сябры. Хроніка апазыцыі — старонка 6.**

## Машыну, якой адмовілі тармазы, спыніць сьцяна

Крыніцы ў прэзыдэнцкай адміністрацыі паведамляюць, што там усё ж прынятае рашэньне пра рэфэрэндум за новы тэрмін для Лукашэнкі. Рэфэрэндум спалучаць з выбарамі ў палату. Саюзнага пытаньня быццам бы ня будзе. Апазыцыя гатовая ўдзельнічаць у выбарах, бо лічыць іх спосабам дайсьці да людзей. Тым больш што пасьпяховы байкот арганізаваць нерэальна. Але ўдзельнічаць у выбарах і пры гэтым байкатаваць рэфэрэндум немагчыма. Зыходзячы з гэтага, апазыцыя мусіць заклікаць людзей сказаць на рэфэрэндуме «НЕ» і прарывацца на выбарах. Ня выключана, што частка дэмакратаў урэшце далучыцца да байкотнай акцыі КХП. Але пакуль яны настроеныя змагацца. **Старонка 2.**

## «Савецкая армія нас не вызваляла»



Гутарка з партызанскім камандзірам Міколам Крукоўскім.

старонка 3

# Блакітная заслона апускаецца

Першымі беларускімі ахвярамі эўраінтэграцыі сталі некалькі маладых людзей, якіх 28 красавіка дэпартавалі з Польшчы як патэнцыйных адмарозкаў-антыглябалістаў. Сярод іх быў і карэспандэнт «НН» Лёлік Ушкін.

Калі б я быў нэўротыкам, то пасьля дэпартацыі абавязкова стаў бы лукашыстам. Для дэпартаваных з Польшчы няма большай маральнай сатысфакцыі, чым глядзець па БТ рэпартажы аб справе Казімежа Віташчыка — польскага дыпляката, якога «чэкісты» выставілі з РБ як «шпіёна».

Больш за ўсё цешыць юрыдычны аспэкт афэры Віташчыка. Гэта ж нейкая прававая казка: злавілі на месцы «крыміналу», прад'явілі абвінавачаньне, выклікалі пасла, зачыталі прыгавор, выперлі дахаты.

У нас было ўсё прасцей: ніякіх абвінавачаньняў, ніякіх консулаў, ніякага імунітэту (сярод нас быў незалежны гомельскі дэпутат Юры Глушакоў). Замест гэтага — бясконцая парылка ў камэндатуры і ідыёцкі дыялёг з памежнікамі: «Адпусьціце». — «А мы вас і не затрымлівалі». — «Тады мы можам ісьці?» — «Гэта забаронена».

Па парадку: 28 красавіка ўсю групу, якая апраўлялася ў Польшчу, зьнялі зь цягніка Берасьце—Тэрэспаль. Частка ехала на альтэрнатыўны форум, які адбываўся паралельна эканамічнаму. Іншыя — у Познань на культурны фэстываль.

Зьвінціўшы нас з цягніка, паставілі ў калідоры камэндатуры пад ахову жаўнераў — і забылі… Гадзіны дзьве мы былі міжвольнымі сьведкамі вясёлага жыцьця польскага памежжа.

Сама тэрэспальская камэндатура ўяўляе сабой паверх аднаго з крылаў будынку вакзалу. Будавалі яго яшчэ за камунай, таму памяшканьне маленькае і непрыстасаванае да сучасных патрэбаў эўрапейскага франтыру. Хіба маглі ведаць архітэктары ў часы Герака пра чачэнскую вайну і фэномэн бежанцаў? Калі б ведалі, абавязкова пабудавалі б пры вакзале велізарны ангар або канцлягер. А так каўказцам, якія прыбываюць у Польшчу агромністымі партыямі, даводзіцца туліцца з барахлом і сем'ямі ў двух пакойчыках недзе 2x3 метры. Выходзіць з пакою забараняецца. Чарга ў туалет на калідоры — да таго ж адзінае месца, дзе можна ўзяць ваду, — пэрманэнтная. Дзеці крычаць. Мужчын ломіць ад дэфіцыту нікаціну ў арганізме. Канфіскаваны ў чайнакоў тавар звалены таксама ў калідоры. Тут жа над імі чыняць справядлівы суд. Адным словам, камуналка.

Разьяднаньне Эўропы: працяг тэмы на старонцы 5.

## Тры колеры: чорны



«Калі баба кідае мужыка, — пранікнёна казаў Вася, — то ён ня плача, ня кідаецца з даху, а бывае, што й ня п'е гарэлкі... Ён проста набірае паветра ў лёгкія і выціскае зь сябе: «Ы-ы-ы!!!» Успаміны пра Васю Шугалея.

старонкі 14–15

# Фарпостаў лёс

Ізноў неспакойна ў Гаіці. Каб замірыць улады з апазыцыяй, сюды выляцеў з Францыі вайсковы дэсант і дыпляматы. За кадрам паведамляецца, што такая ўжо тутэйшая традыцыя, бо краіна была колісь францускай калёніяй. Колісь — гэта ў XVIII стагодзьдзі.

Гаіці — першая незалежная рэспубліка ў сваёй частцы сьвету. Але 200 гадоў тае незалежнасьці не зрабілі краіну на высьпе сярод Карыбскага мора ані заможнай, ані дэмакратычнай. Па завядзёнцы кожнага разу камэнтатары й адмыслоўцы згадваюць цяжкую каляніяльную мінуўшчыну. Яе, выходзіць, гаіцяне й за два стагодзьдзі не пераадолелі. Гаіці для сьвету — вуду, зомбі, Дзювалье.

Ці ня кожнае беларускае выданьне па эканамічнай геаграфіі, горадабудаўніцтве, краязнаўстве ці музэязнаўстве, гісторыі адукацыі ці ахове прыроды мае разьдзел ці хоць абзац, прысьвечаны жахам апошняе вайны. Абавязкова ёсьць. Напрыклад: «За гады вайны фашысты нанесьлі велізарны ўрон народнай гаспадарцы і культуры рэспублікі, зьнішчылі й спустошылі вялікія каштоўнасьці, створаныя шматгадовай працай беларускага народу, які страціў звыш паловы нацыянальнага багацьця. Матэрыяльныя страты ў разьліку на душу насельніцтва ў Беларусі былі самымі высокімі сярод саюзных рэспублік» («Гісторыя беларускага мастацтва», т.5).

Гэта пісалася й пішацца зь нейкім самавітым гонарам, амаль з мазахісцкай асалодаю вось ужо 60 гадоў, больш за паўстагодзьдзя. За гэтымі каравымі штампамі — «звыш паловы», «на душу насельніцтва» і г. д. — хаваецца магчымасьць несупынна сьпісваць няўдачы ў гаспадарцы й культуры на апошнюю вайну. Не зьберагглі помнікі дойлідства — вайна была. Гразь і няўтульца ў калгасах — вайна была. Пэнсіянэры ў нялюдзкіх умовах — вайна была. А тады давай махаць кулакамі, вірлаваць вачыма, падымаць голас: «Мы сваімі грудзямі», «Вялізарныя страты», «Як ніводзін народ у сьвеце»… Тым часам Беларусь застаецца для сьвету — вайна, Чарнобыль, Лукашэнка.

Між астатнім, што да помнікаў дойлідства, то ці ня дзьве трацiны самых каштоўных здабыткаў нашых былі зьнішчаны за камуністычным ладам пасьля 1940-х гадоў. А першую трацiну зьнішчылі перад вайною, у 1930-я. Ды хіба гэта давядзеш спакойна, калі чалавеку родам з СССР хочацца чуць нешта зусім іншае. З гэтае хлусьні, з тысячаў іншых паўпраўдаў і няпраўдаў паўстаў велізарны міт. Міт, які чэпка трымае нас за горла апошнія 60 гадоў.

Як старадаўні міт пра каляніяльную нядолю вось ужо два стагодзьдзі трымае Гаіці. І не зважаючы камэнтатары на тое, што гэтую краіну акружаюць дзясяткі найзаможнейшых дзяржаў сьвету, крыху меншых ці крыху больших, якія здабылі незалежнасьць толькі некалькі дзясяткаў год таму. Аднак брэнд «паўкаляніяльнай эканомікі» й «посткаляніяльнай залежнасьці» засьціць усё. Бо гэта выгадна карумпаваным тамтэйшым элітам, што жывуць на чужынскія датацыі й гранты, ды замежным інвэстарам, якія маюць амаль дармовыя працоўныя рукі. Ці не таму ў Гаіці так ніколі й не было дэмакратыі й дабрабыту? Наканаванасьць. Наканаванасьць застаецца дзікім гаротным краем, што сам сваім лёсам распарадзіцца ня можа.

Беларусі ж, з брэндам «самай пацярпелай», выпала роля заставацца «фарпостам» Расеі. Дарэчы, гэтаксама цягам двух стагодзьдзяў. Калі тут не было вайны, то да яе тут несупынна рыхтаваліся. Будавалі вялізарныя фартэцыі, разьмяшчалі гарнізоны, рылі акопы. Супраць палякаў, французаў, немцаў, NATO… Краіне, якую атачылі ў адначасьсе адразу тры краіны Эўразьвязу, самы час прыгадаць апошнюю вайну й агледзець свае рубяжы чарговы раз. Ізноў будзе гучаць «мы — яны», «баронім заходнія рубяжы», «зробім усё», «ляжам касьцьмі»… Фарпостаў лёс. Наканаванасьць?

Калі былі жывыя мае старэйшыя сваякі, бабці й дзяды, то зь іхных расповедаў у мяне нараджаўся зусім іншы вобраз вайны. Ён быў бясконца далёкі ад стракатых вобразаў з экранаў і падручнікаў. Старэйшыя распавядалі пра СТРАХ. Чатыры гады акупацыі былі гадамі несупыннае боязі за сябе й блізкіх. Ніхто са старых не называў сябе «пераможцам». Яны былі ахвярамі жудаснай катастрофы, што адбылася ў выніку нялюдзкіх гульняў між сталінскім СССР і гітлераўскай Нямеччынай. Трэ было тыя гады выжываць, не спадзеючыся ні на якіх вызваліцеляў. І была затоеная крыўда на тых, хто фанабэрыўся сваёй непераможнасьцю, а ня здолеў абараніць. Ні ад фашыстоўскае навалы, ні ад бандытаў, што называліся партызанамі. Такой вайна засталася ў памяці заходнебеларускіх сялянаў. Для ўсходніх беларусаў гэта было інакш — пра гэта апавядае Мікола Крукоўскі на старонцы 3.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Разам з адыходам сьведкаў вайны паўпраўда і няпраўда ўсё болей запаўняюць ідэалягічную прастору. З гісторыі бярэцца адно агонь, а ня попел. Велізарная крывава-балотная бутафорыя ў плястыкавых блішчынках, што завецца «Вялікая Айчынная вайна», захінула сабою ўвесь даваенны нацыянальны досьвед, усю тысячагадовую гісторыю.

Вось што не прагучыць на чарговых шумных і сумных гуляньнях, дык гэта тое, што ў Беларусі другую сусьветную вайну распачаў СССР, разам з нацысцкай Нямеччынай падзяліўшы Польшчу ў 1939 годзе… Не пакажуць здымкаў бальшавіцка-фашысцкіх братаньняў… Не згадаюць тысяч бязьвінна забітых бяз суду палітычных вязьняў на пачатку вайны… Не прагучаць словы жалобы й пакаяньня за Галакост. Пра жыдоў цяпер нагул згадваць «не прынята»... Не згадаюць загаду Сталіна зьнішчаць усё ў «тыле ворага», то бок зьнішчаць Беларусь… Ніхто не адважыцца казаць пра ролю рэзыстантаў у польскіх мундзірах. Сёньня няёмка згадваць і пра першы бой дывізіі імя Касьцюшкі пад Ленінам, што пад Горкамі. У сьвятле цяперашніх дачыненьняў з заходнім суседам гэта недарэчы. Лішне казаць, што ня знойдзецца ў вуснах уладных прамоўцаў ані слоўца пра заходніх саюзьнікаў… Часы не такоўскія.

Уладная Беларусь 60 гадоў усё ходзіць у тым шынэлі, лашчыць зброю, што ўсё вісіць на сьцяне. Да наступнага акту п'есы?

**Сяргей Харэўскі**

# Машыну, якой адмовілі тармазы, спыніць сьцяна

Працяг са старонкі 1.

Лёс прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году вырашаўся за два гады да іх правядзеньня — у 1999-м. Улады пачалі той год з арышту экс-прэм'ера Міхаіла Чыгіра. З боку апазыцыі 1999-ы адзначыўся падпольнымі выбарамі, уцёкамі Шарэцкага, расколам БНФ. Усё гэта адбывалася на фоне вайны ў Косаве, а ўнутры — псэўдадыялёгу ўладаў і апазыцыі, да якога ўлады змусіла Эўропа.

За пяць гадоў амэрыканцы перамясьціліся з Косава ў Ірак, у Эўропе зьявілася новая ўтопія — што дэмакратызацыю Беларусі можа правесьці… Расея. Так, прынамсі, вынікала з заявы міністра эўрапейскіх справаў Вялікай Брытаніі Дэніса Макшэйна ў інтэрвію расейскаму агенцтву навінаў «РИА-Новости»: «Эўрапейскі Зьвяз і Расея павінны супрацоўнічаць у пытаньні падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі».

За два гады да выбараў 2006-га лёс Чыгіра паўтарыў Міхаіл Марыніч. Чыгір пакінуў Лукашэнку ў 1996-м і трапіў за краты ў 1999-м. У Марыніча шлях да турмы заняў таксама тры гады пасьля паходу ў прэзыдэнтуру ў 2001-м. Усё паўтараецца з дакладнасьцю да месяца. Што далей? Новыя палітычныя забойствы?

Польскія СМІ зьвязалі красавіцкія акты варожасьці (шпіёнскі фарс) з прошукамі ня толькі Ерына, але й наўпрост расейскіх спэцслужбаў, якія мелі на мэце перашкодзіць паляпшэньню адносінаў з Захадам. Калі гэта так, новых забойстваў вымагае сама схема, бо нешта ж мусіць зрабіць немагчымымі спакусьлівыя праекты памяркоўнага крыла: нармалізацыю адносінаў з Захадам, паступовую дэмакратызацыю, прыватызацыю, выбар пераемніка.

Зрэшты, схему можа задаволіць і калектыўнае палітычнае забойства — забойства пэрспэктываў краіны, яе лідэраў і яе шанцаў на інтэграцыю ў Эўропу. Чарнобыльскі вяж і арышт Марыніча ў такім разе выглядаюць першымі актамі гэтае драмы. Наступны — пампэзная дэманстрацыя ўсенароднага адабрамсу на 60-я ўгодкі вызваленьня ад немцаў. Далей — канчатковая падвёрстка Канстытуцыі пад аднаго чалавека.

Прага ўлады, смак улады — што яны робяць зь людзьмі! Машыну, якой адмовілі тармазы, спыніць можа толькі сьцяна.

Калі на рэфэрэндум будзе наўпрост вынесены працяг паўнамоцтваў да 2009 г., гэтага народ ня прыме. Калі ж гаворка пойдзе аб праве для Лукашэнкі балятавацца яшчэ раз, дык выйгрыш рэфэрэндуму зусім ня будзе азначаць аўтаматычнага выйгрышу выбараў у 2006-м. Самая непрадказальная ўлада, 10 гадоў паўтараючы тыя самыя схемы, становіцца ўсё больш прагназаванай, што пазбаўляе яе шанцунку на полі ірацыянальнай палітыкі. А ў прадказальную палітыку Лукашэнка гуляць ня зможа.

**Барыс Тумар**

## Балта-чарнаморская ідэя жывая

Працягнуць нафтаправод Адэса—Броды да Вэнтспілсу прапанавала латышам Беларусь. Пра гэта напісала газэта «Коммерсант Baltic daily». З такой прапановаю да фірмы «Ventspils nafta» і латвійскага міністэрства зносін зьвярнуліся прадстаўнікі «Белнафтахіму». 26 красавіка ў Менску, са словаў кіраўніка транзытнага аддзелу міністэрства зносін Латвіі Андрыса Малдупса, адбыліся кансультацыі па гэтым пытаньні.

Вэнтспілскі тэрмінал зьяўляўся галоўным портам для экспарту расейскай нафты ў Эўропу. Для гэтага выкарыстоўваліся нафтаправоды з Полацку. Але ў 2002 г. Расея зьнізіла паставкі нафты праз Латвію, а потым і зусім іх спыніла ды пачала выкарыстоўваць уласныя новазбудаваныя тэрміналы.

Нафтаправод Адэса—Броды быў пабудаваны ў 2002 г., каб пампаваць каспійскую нафту ў Эўропу. Яго прапускная магчымасьць — 9—14,5 млн т нафты за год. Прадугледжваецца пашырэньне магчымасьці да 40—45 млн т. Эўрасаюз пакуль ня даў грошай для працягу руры да польскага Плоцку, які зьвязаны з Гданьскім партом. Цяперака тая труба не выкарыстоўваецца.

Беларусы ж прапанавалі латышам працягнуць нафтаправод супольнымі намаганьнямі з Бродаў да Мазыра, адкуль ідзе труба да Полацку і далей да Вэнтспілсу.

**Руслан Равяка**

## ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Зьезд АГП

8 траўня ў Менску пройдзе чарговы зьезд Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Дэлегаты зацьвердзяць новую рэдакцыю праграмы партыі. Таксама адбудуцца выбары кіраўніцтва партыі.

### «Эўропа» ня будзе копіяй

Упраўленьне па ахове спадчыны пагадзілася на аднаўленьне гатэлю «Эўропа» на месцы былога гарадзкога тэатру. Таксама гатэль будзе не такім, як калішні: нават плошча забудовы будзе саступаць плошчы фундамэнтаў былое гасьцініцы.

### Новы кіраўнік Асамблеі

На V кангрэсе незарэгістраванай Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацый абраны новы кіраўнік рабочай групы — лідэр Цэнтру «Супольнасьць» Сяргей Мацкевіч. Таксама на кангрэсе, што адбыўся на першамай, прапанавана стварыць агульнанацыянальны фонд узаемнае падтрымкі ўдзельнікаў парлямэнцкае выбарчае кампаніі.

### У ЗША і Брытаніі — антываенны рух

52 былыя паслы зьвярнуліся да прэм'ера Блэра, каб ён адмовіўся ад падтрымкі «прырэчанай на паразу» блізкаўсходняй палітыкі ЗША. Маюцца на ўвазе ня толькі акупацыя Іраку, але й падтрымка Ізраілю. З аналягічным лістом зьвярнулася да прэзыдэнта ЗША група былых амэрыканскіх дыпламатаў.

### Татарская — дзяржаўная ў Расеі

У Маскве на Пушкінскай плошчы прайшоў мітынг, удзельнікі якога, татарскія актывісты, запатрабавалі надаць татарскай мове статус другое дзяржаўнае ў Расеі.

**МБ**

# «Савецкая армія нас не вызваляла»

## Мікола Крукоўскі: Гэта мы, партызаны, расчысьцілі ім дарогу на Бэрлін

**Доктар філязофскіх навук Мікола Крукоўскі трапіў на фронт у няпоўныя 18 гадоў. Пасьля быў Вяземскі кацёл, акупаваная Ворша, лес. Ён стаў начальнікам штабу аднаго з партызанскіх атрадаў ІІ Заслонаўскай брыгады. Перад Днём Перамогі з вэтэранам Міколам Крукоўскім гутарыць карэспандэнт «НН».**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Чым вам згадваецца 41-ы год?**

**М.К.:** Гэта быў страшны год. Я бачыў, як Расея кінула Беларусь. Толькі пасьля я зразумеў, што — кінула. Гэта было ганебна. Так і цяпер Лукашэнка гаворыць, што Беларусь будзе шчытом для Расеі, прыме на сябе ўдар. Яна ўжо раз прыняла ўдар! Мы думалі, што войска будзе абараняць Беларусь на старой мяжы, але ніякіх баёў там не было. У мяне каля лецішча й цяпер стаіць дот — на ім ні адной шкрабіны няма, ніхто па ім ня стрэліў ні разу. А супраціўляцца пачалі толькі пад Смаленскам.

**«НН»: Як Вы трапілі ў партызаны?**

**М.К.:** Я паступіў добраахвотнікам у школу малодшых камандзіраў, адтуль трапіў на фронт. Апынуўся ў акружэньні — у Вяземскім катле. Мы тройчы хадзілі на прарыў. Я скажу вам, што амэрыканскія кінафільмы, дзе бомба ўзрываецца і людзі ляцяць, шавелячы нагамі, — гэта проста сьмешна. Вайна ў нас была ляжачая: ляжыш і зямлю грызеш. Падымі палец — і ўсё. Ну, яшчэ неабстралянасьць, вядома…

На трэцім прарыве трапілі ў рукі немцам. Таксама было пачуцьцё непрыемнае — уздымаць рукі ўгору. Мы ж выхаваныя былі, што трэба рабіць харакіры… Ішлі на вёску выматаныя, есьці не было чаго. Сьнег тады ў кастрычніку выпаў. Падыходзім да вёскі — глядзім, выходзяць адзін за адным пяць хлопцаў у нейкай нянаскай форме. Яны з аўтаматамі, а ў нас іржавыя трохлінейкі, і за намі мэтраў 300—400 роўнага поля, пасыпанага сьнегам. Потым мяне энкавэдыст пытаў: «Як, чаму вы зрабілі гэта?» Я яму хацеў сказаць: «Паглядзеў бы я на цябе». Вайна ёсьць вайна. Не было сярод нас камікадзэ, бо рамантызм наш быў пераважна кніжны. Я памятаў і калектывізацыю, і як уначы прыходзілі, грукалі, забіралі. Усё гэта аслабляла наш рамантызм.

Сталін хацеў на вобразе Матросава «прысабачыць» нам ідэю камікадзэ. Для мяне ўжо тады гэта было непрымальна: я ўспрымаў гэта як нешта фальшывае й бяздарнае. Я ведаю, што такое куля, якая трапляе ў чалавека. Калі б ужо я падпоўз да гэтай амбразуры (хоць гэта вельмі страшна!), дык ужо зрабіў бы нешта іншае, але ня сэрцам жа закрываць! Гэта ж не тэатар…

**«НН»: Чаму Вы ў такім выпадку не засталіся дома?**

**М.К.:** Чаму я пайшоў у партызаны? Гэта быў грамадзянскі абавязак, выхаваньне працавала. Гэтага нельга ня ўлічваць. Я бачыў брыдкае, паскуднае калябаранцтва: такія падонкі йшлі да немцаў!.. У нас суседзі ўдзельнічалі ў расстрэлах яўрэяў. Мы якраз жылі насупраць яўрэйскіх могілак, дык я на свае вочы бачыў тыя расстрэлы... Бачыў, як немец на базары дае высьпятка жанчыне, якая яму ў маткі падыходзіць.

**«НН»: У акупаванай Воршы Вы доўга былі?**

**М.К.:** Каб замацавацца ў Воршы, я паступіў на працу ў БНД — Беларускі народны дом. Гэта была культурная ўстанова. Яна заняла будынак аэраклюбу, дзе да таго быў сабор, але развалены яшчэ ў савецкія часы. Хор там быў, пачыналі ствараць аркестар, дзе я й павінен быў граць. Нават канцэрт адзін далі на ільнокамбінаце. БНД быў проста астраўком для выратаваньня. Там сабраліся інтэлігентныя людзі. Я выкарыстоўваў яго як «страху» для сваёй агентурнай дзейнасьці.

**«НН»: Ці ўспрымалі ў той час работнікаў БНД як калябарантаў?**

**М.К.:** Я дык сьвядома ішоў туды для «страхі», бо ўжо трымаў сувязь з партызанамі. Мне быў патрэбны аўсвайс. Там былі культурныя, адукаваныя людзі. Быў там, напрыклад, Мікалай Алтухоў, паэт, пісаў па-расейску. Ён напісаў быў верш, надрукаваў яго і потым адседзеў. Гэта не былі калябаранты. Калябаранты былі тыя, хто прымаў удзел у яўрэйскіх расстрэлах. Я бачыў, як мае суседзі беглі па яўрэйскіх хатах пасьля расстрэлаў, забіралі падушкі й іншае.

**«НН»: Былі ў Вас моманты сумневаў і пераацэнкі Вашага змаганьня?**

**М.К.:** Я быў упэўнены спачатку і цяпер скажу тое самае: наша справа была сьвятая! І ў гэтым сэнсе я ўспрымаў як зьнявагу праверку, якую мне наладзіла НКВД, калі я патрапіў ужо ў Маскву ў 1944 г. І даведку зь лягеру насіў з пачуцьцём, што калі-небудзь буду тыкаць яе ў нос як маральную кампэнсацыю.

Нават афіцыйная прапаганда прызнавала, што партызаны кантралявалі 60% тэрыторыі. Гэта тады была ўжо неўсьвядомленая нацыянальна-вызвольная барацьба.

**«НН»: А як жа засылка энкавэдыстаў з-за лініі фронту?**

**М.К.:** На гэтым цяпер ідзе страшная спэкуляцыя. Засылкі мы ўспрымалі як армейскія апэрацыі. У часы вайны ГРУ (Галоўнае разьведвальнае ўпраўленьне) і НКВД працавалі аб’яднана. З намі працавала разьведка ГРУ. Закідвалі разьведчыкаў армейскіх, дывізійных, корпусных, якія гадамі жылі ў нас. І калі ў нас быў бой ці немца мы зловім, дык яны прыяжджалі да нас, бралі зьвесткі й прыпісвалі іх сабе. А самі перажаніліся й толькі эшалёны лічылі. Але захоўвалі вайсковую форму, не пераапраналіся. Ведалі: калі немцы іх схопяць, дык будуць лічыцца ваеннапалоннымі. Разьведчык, але ваеннапалонны — гэта закон разьведкі. А калі пераапрануты — шпіён, што немцы лічылі незаконным. Роля гэтых агентаў у нас была вельмі малая. Нас было 370 тысячаў. 90% партызанаў — беларусы.

Спэкуляцыі ж пачаліся пасьля вайны. Камбрыг першай Заслонаўскай брыгады Іваноў неяк у 60-я сабраў нас: ён напісаў успаміны і хацеў пачытаць нам. Я паслухаў і выказаў яму: «Паслухайце, у вас выходзіць, што мы тут былі толькі для таго, каб лавіць здраднікаў». Мы ж ваявалі! У нас шмат было афіцэраў-акружэнцаў.

Мяне абурыла нядаўняя перадача на АНТ, якую вёў нейкі Корзун. Ён казаў, што партызанскі рух быў арганізаваны НКВД. Прымазаў туды генэрала Судаплатава, яшчэ некага, што яны былі пачынальнікамі гэтага руху. Гэта чорт ведае што! Гэта проста спробы прымазаць гэтых людзей да народнага руху. Сталін нас баяўся! Нам вельмі куца давалі зброю: дзясятак вінтовак на брыгаду з паўтары тысячы чалавек, тол мы выплаўлялі з снарадаў на вогнішчах. Ужо тады мы пыталіся: чаму не даюць нам аўтаматаў? У 43-м годзе аўтаматы былі ва ўсёй арміі, яны былі танныя. Я аўтамат атрымаў толькі ў 43-м годзе, калі да мяне дайшла чарга. Але я быў ужо паранены і аўтамат мне быў не патрэбен. У нас было толькі тры аўтаматы на атрад. Калі б мы былі нармальна ўзброеныя, мы б маглі даваць немцам дыхту такога, як цяпер чачэнцы — расейцам.

На фронце проста «пяклі» лейтэнанцкія званьні, людзі на хаду выбіваліся ў генэралы. Нам званьняў не далі. Я камандаваў атрадам у 150 чалавек — гэта паміж ротай і батальёнам — і лічыўся радавым. І атрымліваў пэнсію як інвалід вайны — салдацкую, а не афіцэрскую. Калі быў студэнтам, атрымліваў 90 рублёў, а армейскія афіцэры, маладзенькія лейтэнанты, — 250—300 рублёў.

**«НН»: А чаму было такое стаўленьне?**

**М.К.:** Сталін баяўся нас, бо ён ведаў, што за намі — Армія Краёва ў Заходняй Беларусі. Мы ўсе кантактавалі, і таму на нас глядзелі падазрона. І калі каго засылалі, дык толькі для таго, каб трымаць нас у руках. Ня ўсе ж партызаны былі камуністамі. Ніякага гэтага «За сталіцу нашай Радзімы Маскву!» ў нас не было. У нас нават чырвонага сьцягу ў атрадзе не было (быў, здаецца, у брыгадзе толькі).

Нас не вызвалялі, як цяпер будуць сьвяткаваць «60-годзьдзе вызваленьня Беларусі». Улада хоча паказаць, што нас вызваліла савецкая армія, у той час як яна нас тут саджала ў турмы! Мы, партызаны-беларусы, расчысьцілі дарогу на Бэрлін. Сюды Чырвоная армія ўвайшла, як нож у масла. У Беларусі ніякіх вялікіх баёў не было, бо тэрыторыя на 60% была свабодная. А за нашымі плячамі АК. Да Одэру тут лёгка каціліся войскі. Немцы тут трымаліся толькі ў мястэчках і гарадах. А ў вёсках іх і не было: яны туды высунуцца баяліся. І занадта вялікі гонар для НКВД казаць, што за гэтай установай пайшоў народ, 370 тысячаў.

Нашых партызанаў можна параўнаць зь югаслаўскімі пад кіраўніцтвам Ціта, якія вызвалілі самастойна палову краіны. Гэта дало Югаславіі магчымасьць не падпарадкоўвацца потым Сталіну. Таму, відаць, у нашых пазьнейшых дысыдэнцкіх колах Ціта карыстаўся вялікай папулярнасьцю.

Васіль Быкаў быў найбольш блізкі да мяне ў поглядах на партызанскі рух. Дзякуючы нашым партызанскім заслугам Беларусь уключылі ў лік заснавальнікаў ААН. Французы пішуць «Рэзыстанс» зь вялікай літары, а мы самі аплёўвалі свой Рэзыстанс. Што найбольш крыўдна — гэта рабілі людзі з апазыцыі. Зь Зянонам Пазьняком мы столькі «бадаліся»: ён казаў — «сталінскія бандыты». Утварылі пры БНФ вэтэранскую арганізацыю, якую ўзначаліў Артур Вольскі, — тады ўжо трохі пацяплеў Зянон. Добрая кніжка Туронка «Беларусь пад нямецкай акупацыяй». Але ён піша: беларусы хаваліся і ад немцаў, і ад партызанаў. Як жа выглядаюць беларусы? Беларус што, зусім ужо гаўно, прабачце? Мы ж ганарыцца павінны! Мы ўхапіліся за перамогу пад Воршай, якая была 500 гадоў таму. А цяперашнія дзяды ж таксама паказалі свой гераізм — пра гэта трэба казаць!

**Гутарыў Зьміцер Дзядзенка**

# Сьвята, якое заўсёды побач

Віталь Тарас

Усё мяняецца, і нават сакральныя сьвяты зь цягам часу губляюць свой сакральны сэнс. 7 лістапада, напрыклад, у суседняй Расеі робіцца Днём прымірэньня й згоды — невядома каго і з кім.

Дзень савецкага друку ўвогуле ўжо, здаецца, нідзе не адзначаецца (хоць традыцыі гэтага самага друку жывыя), як і дзень народзінаў Карла Маркса. 22 красавіка становіцца падставаю для апытаньня, падчас якога высьвятляецца, што каля трынаццаці адсоткаў посткамуністычнага грамадзтва ўжо й ня ведае, хто такі Ленін.

Праўда, бываюць і адваротныя кульбіты ў часе. Вось зусім сьвежы прыклад. Здавалася, зусім яшчэ нядаўна 3 ліпеня было абвешчана ў Беларусі Днём Рэспублікі. Але ж чытаем паведамленьні БелТА ці розных іншых агенцыяў пра Берасьцейскую крэпасьць (яшчэ адзін сакральны вобраз) і рэстаўрацыйныя работы, якія там ідуць… І што мы бачым? Аказваецца, сёлета 3 ліпеня будзе адзначацца дзяржаваю менавіта і ў першую чаргу як Дзень вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Г.зн. колішняму савецкаму сьвяту вернуты яго пачатковы сэнс? Думаецца, штатным прапагандыстам удасца ўсё ж неяк вырашыць гэты парадокс.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Аляксандар Радзькоў, Аляксандар Зімоўскі, Міхаіл Орда, Лідзія Ярмошына, Павал Якубовіч, Рыгор Кісель, Уладзімер Мацьвяйчук на адкрыцьці выставы «СМІ ў Беларусі». Чаму так мала энтузіязму, спадарства?**

Куды больш складаней выглядае сытуацыя з 1 траўня. Дэманстрацыі працоўных, як і прафсаюзны рух, цяперашнім беларускім уладам недаспадобы. Лепей канцэрт-маёўка на чале са старшынём ФПБ спадаром Козікам пад акампанэмэнт сьпеваў Наташы Каралёвай. Між тым, 1 траўня цяпер яшчэ становіцца Днём пашырэньня Эўрапейскага Зьвязу. З аднаго боку, кіраўнік дзяржавы ў сваім штогадовым пасланьні даў зразумець, што з усіх саюзаў менавіта гэты зьвяз цяпер самы блізкі беларускаму сэрцу. З другога боку, гала-канцэрт у Дзяржаўным цырку ў Менску з нагоды чужога сьвята падаўся беларускаму кіраўніцтву недарэчным.

Пачуцьці кіраўніцтва зразумець можна: місія Міжнароднае арганізацыі працы ў Беларусі адной сваёй прысутнасьцю нагадала, што ў Эўрапейскім зьвязе правы прафсаюзаў даўно зьяўляюцца недатыкальнымі, чаго ня скажаш пра беларускія прафсаюзы (дый пра ўсе іншыя правы таксама). А тут яшчэ эўрапейскія сталіцы неяк няправільна рэагуюць на арышт экс-пасла Міхаіла Марыніча ды затрыманьне чарговага «польскага шпіёна». Варшава, напрыклад, дала зразумець, што прысутнасьць прэм'ер-міністра Беларусі на Сусьветным эканамічным форуме на тле дыпламатычнага скандалу ў Менску будзе выглядаць непрыстойна, і таму даводзіцца сьпешна прыдумляць вэрсію зь пільным даручэньнем кіраўніка дзяржавы, якое вымагае бязвылазнай прысутнасьці прэм'ера ў Беларусі. Усё гэта як бы даўно ўвайшло ў звычайную практыку адносінаў з заходнімі суседзямі, але разам з тым пакідае адчуваньне нейкай разгубленасьці й расчараванасьці на ўзроўні самага высокага начальства — за выключэньнем аднае асобы.

Здаецца, Эўрапейскі Зьвяз яшчэ нядаўна разглядаўся цяперашнім кіраўніцтвам Беларусі як вобраз новай, недасягальнай (але ад гэтага ня менш прывабнай) мары, якой некалі быў камунізм. Злучаныя Штаты Амэрыкі не падыходзяць, бо заўсёды лічыліся апорай антыкамунізму. А вось пра Злучаныя Штаты Эўропы яшчэ Ільліч марыў. Акрамя таго, выявілася, што Эўропа — гэта ня толькі суворы туманны Лёндан зь яго выведкай і Бі-Бі-Сі, ня толькі Парыж з наскрозь буржуазнымі кабарэ ды ня менш буржуазнай «Фігаро», але шчэ й Польшча, Чэхія, Літва, Латвія. А хто ж з савецкіх людзей хоць аднойчы ня езьдзіў адпачываць у Карлавы Вары ці на Балтыйскае ўзмор'е альбо гандляваць у Варшаву ці ў Беласток?

На жаль, большасьці шараговых грамадзянаў на бліжэйшы час пра гэта давядзецца забыць. І справа нават ня ў коштце візаў, а ў складанасьці працэдураў зь яе атрыманьнем, афармленьнем пашпартоў, перасячэньнем мяжы і г.д. Высокаму начальству, гэта, вядома, не замінае. Кажуць, некалькі высокапастаўленых асобаў няблага адпачылі нядаўна ў тых самых Карлавых Варах, скарыстаўшы дыпламатычныя льготы. Так што былыя крыўды на адмаўленьне афіцыйнае Прагі ў візе вышэйшаму кіраўніку Беларусі, пэўна, забытыя. Прынамсі, ягонымі чыноўнікамі.

Вядома, што ў самы разгар халоднае вайны высокім савецкім чыноўнікам, а таксама прафсаюзным разьведчыкам даволі лёгка ўдавалася вырашаць для сябе праблему камандзіровак на Захад — ці ў складзе якой-небудзь пісьменьніцкай дэлегацыі, ці на навуковую канфэрэнцыю. Заходнія краіны такая сытуацыя, калі да іх прыяжджалі асобныя, больш роўныя за астатніх грамадзяне з Усходу, цалкам задавальняла. Задавальняе й цяпер. Гісторыя з часовай забаронай на ўезд у эўрапейскія краіны й ЗША найбольш высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў паказала — пэўкацца на Захадзе з такімі рэчамі нікому ня хочацца. Прасьцей узьвесьці новую «бэрлінскую сьцяну» на мяжы, выдаткаваўшы на яе абсталяваньне ды ахову агромністыя грошы. І пускаць да сябе ў спрошчаным парадку пасобных грамадзянаў — тых самых высокіх начальнікаў ды людзей іншых заможных катэгорыяў, для якіх няма ніякай цяжкасьці атрымаць усе неабходныя дакумэнты, тым больш за кошт дзяржавы. Праўда, пэўныя зрухі ўсё ж адбываюцца. У Заходняй Эўропе ўсё болей разумеюць неабходнасьць пакінуць дзьверы адчыненымі для беларускіх няўрадавых арганізацыяў ды журналістаў. Але ад разуменьня да гатовасьці ўкладаць грошы ў праекты, якія б пашыралі кантакты паміж людзьмі, — шлях няблізкі.

> Забарона канцэрту ў гонар Эўразьвязу, як і шпіёнскі скандал ці арышт кіраўніка «Эўрапейскага руху» — звычайная практыка адносінаў з заходнімі суседзямі, але разам з тым пакідае адчуваньне нейкай разгубленасьці й расчараванасьці на ўзроўні самага высокага начальства.

З другога боку, кожнаму беларусу, які хоць аднойчы выяжджаў у «шэнгенскую зону», добра вядома, што для тамтэйшых мытнікаў, памежнікаў, чыноўнікаў і проста звычайных людзей ён — «рускі», нават калі будзе гаварыць па-беларуску і надзене кашулю зь беларускім арнамэнтам. Заходняя Эўропа яшчэ ня ведае, як паставіцца да навеяўленых сяброў Эўразьвязу і хто яны ўвогуле такія. А патрабаваць ад яе дыфэрэнцыяванага падыходу да Расеі й Беларусі як дзьвюх самастойных дзяржаваў — далібог, зарана.

Цяпер, як і некалі ў 70-я гады мінулага стагодзьдзя, перад вайной у Аўганістане, адносіны на Захадзе да Расеі (тады СССР) пачалі паступова мяняцца. Тады гэта ў многім было зьвязана з моцным дысыдэнцкім і праваабарончым рухам у Савецкім Саюзе, актывісты якога змаглі даць доказы таго, што прырода савецкага рэжыму ня толькі не зьмянілася, але ён становіцца ўсё больш агрэсіўным і небясьпечным для ўсяго сьвету. Тым ня менш, і ў ЗША, і асабліва ў некаторых краінах Заходняй Эўропы яшчэ даволі доўгі час дамінаваў такі падыход: лепей жыць з брутальным суседам у міры й згодзе, чымся ваяваць зь ім.

Нешта падобнае мы назіраем і ў сёньняшняй аб'яднанай Эўропе. Як пішуць заходнія назіральнікі, невялікія краіны Паўночнай Эўропы выказваюць значна больш крытычную пазыцыю ў дачыненьні да пуцінскай Расеі, парушэньня там грамадзянскіх правоў і свабодаў, акупацыі Чачэніі, чымся, скажам, Францыя, Нямеччына, Італія. Зразумела, у вялікіх эўрапейскіх краін і праблем заўсёды больш, таму яны не хацелі б іх памнажаць яшчэ й за кошт напружанасьці з суседзямі на Ўсходзе.

Менавіта ў кантэксьце адносінаў паміж Эўрапейскім Зьвязам і Расеяй, хочам мы таго ці не, яшчэ доўгі час давядзецца разглядаць і пэрспэктывы адносінаў Беларусі з новай Эўропай. Аднак, калі гэтая Эўропа будзе надалей ігнараваць тое, што адбываецца ў Беларусі, і тое, як гэтая сытуацыя ў сваю чаргу ўплывае на сытуацыю ў Расеі, заходнія стратэгі могуць моцна памыліцца ў ацэнках інтэнцыяў цяпер ужо пуцінскага рэжыму.

Ну, а беларусы па-ранейшаму былі й застаюцца чужымі на чужых сьвятах — што на былых савецкіх, што на сёньняшнім эўрапейскім «першамаі». Ці прыйдзе калі-небудзь і на беларускую вуліцу сьвята?

# Блакітная заслона апускаецца

Працяг са старонкі 1.

Нарэшце чарга дайшла да нас.

Высьветлілася, што нас трымаюць за антыглябалістаў, якія зьбіраюцца сапсаваць інвэстыцыйны імідж польскай сталіцы. Ваў! Хіба альтэрнатыўны форум не праходзіць абсалютна легальна ў гатэлі «Вікторыя» ў цэнтры Варшавы? У выпадку, калі антыглябалісты ў Польшчы па-за законам, першым трэба было б вязаць ня нас, а Яцака Кураня. Адзін з заснавальнікаў «Салідарнасьці» выступіў з адкрытым лістом пад назвай «Зварот да маіх сяброў-антыглябалістаў».

А што будзе, калі ў Тэрэспаль прыедзе сам Жак Шырак? Прэзыдэнт Францыі прабашляў антыглябалістам на форум 2002 г. у Порта-Алегрэ. Няўжо таксама здымуць зь цягніка і будуць гадзінамі марынаваць у калідоры?

Падчас допыту мы адкрылі для сябе вельмі шмат вясёлых рэчаў у прававых стандартах новай пашыранай Эўропы.

Раней я ўжо бачыў акцыі супраць антыглябалістаў, але там усё адбывалася неяк інакш. У Празе 2000 г. тых, хто паліў «Кентукі Чыкен Фры», вінцілі, а тыя, хто не паліў (ваш пакорны слуга), стаялі на тратуары і пацягвалі з Сокалавым-Воюшам «будвайзэр». Дзіўны Habitus Corpus у новай Эўропе — без прэзумпцыі невінаватасьці і фармальных адзнакаў крыміналу.

Ня менш экзатычна выглядала пытаньне аб палітычных сымпатыях, быццам гэта можа ўплываць на прыгавор. Цікава, што зрабілі б памежнікі, калі б я з прыколу сказаў, што маім кумірам зьяўляецца шэйх Аль-Садр? Напэўна, ужо грымеў бы кандаламі на Гуантанама.

Ня менш пазабавіў і працэс вобшуку. Зразумела, шукалі бомбы, гексаген, бактэрыі сібірскай чумы, на апошні выпадак — інструкцыю «Курс для чайніка-тэрарыста. Як узарваць станцыю Варшава-Ўсходняя». У выніку да справы прышылі толькі падручнік польскай мовы і дыктафон. Якім чынам, камбінуючы гэтыя рэчы, можна арганізаваць тэракт, мне асабіста невядома. Хіба што даць каму-небудзь балюча па кумпале?

«Ды вы ня парцеся, — сказаў нам чаўнок-армянін у калідоры, — калі б нават вы Тэрэспаль праехалі, вас затрымалі б на наступным кардоне за 30 км ад Варшавы. А не, дык узялі б проста на плятформе Варшавы-Цэнтральнай». О цудоўная новая Эўропа!

На шостую гадзіну арышту нам нарэшце зачыталі вэрдыкт — ануляваньне віз і дэпорт. На лягічнае пытаньне, што значаць параграфы, адпаведна якім нас бяз суду вызналі вінаватымі, мы атрымалі фантастычны адказ: «Кодэкс у начальніка, а ён пайшоў дахаты». Памятаючы афарызм Ежы Леца «Лепш уваходзіць у дзьверы з надпісам «Пабочным уваход забаронены», чым з надпісам «Выхаду няма», мы хуценька рэціраваліся на радзіму.

Пасьля эўрапейскіх рэаліяў родная старонка нагадвала бастыён палітычнага плюралізму і дэмакратыі. Берасьцейскі мытнік злавіў мяне з кіпай антылукашэнцкай літаратуры. Яе мы хацелі раздаць у Польшчы замежнікам. Паглядзеўшы на карыкатуру бацькі, сказаў: «Малады чалавек, у прынцыпе, правозіць такое забаронена, аднак мы ўсё разумеем… Ідзіце і болей так не рабіце». А ў ПАРЭ кажуць, што ў нас недэмакратычны рэжым!

Ваяж у Тэрэспаль назаўсёды прапішацца ў памяці хаця б таму, што ўпершыню ў жыцьці я прывёз з Польшчы гарэлку. Яе мы калектыўна выжралі на наступны дзень, вывучаючы выдадзеную ў Тэрэспалі «дэцызію».

Больш за ўсё занепакоіў пункт, адпаведна якому нам далі высьпятка як асобам, што **патэнцыйна** пагражаюць грамадзкаму парадку. Калі Лукашэнка скамунізьдзіць у эўрапейскіх мянтоў іх мэтады, то ўсёй апазыцыі — каюк. Усіх можна будзе прэвэнтыўна пасадзіць нават без судовых фармальнасьцяў.

Бянтэжыць і такі момант: на падставе якой інфармацыі эўрапейскія пінкертоны вылічылі, што мы схільныя да антыэўрапейскага гвалту? Відавочна, за Бугам у курсе пра факты маёй біяграфіі, якія сьведчаць аб лятэнтнай эўрафобіі. Паглыбіўшыся ва ўспаміны, бязь цяжкасьцяў знаходжу як мінімум тры акты грэхападзеньня. Па-першае, у 1990 г. у Кіеве далучыўся да галадоўкі студэнтаў, што пратэставалі супраць саюзнага дагавору. Адмовіўшыся ад ежы, мы, натуральна, нанесьлі апэркот эўрапейскім вытворцам прадуктаў, перш за ўсё польскім фэрмэрам.

Рабіць падкопы супраць Эўропы я працягнуў у Вільні ў студзені 1991-га, дзе ашываўся разам з валанцёрамі — абаронцамі літоўскага парлямэнту. Памятаю, на «ўра» падтрымалі яны маю прапанову сушыць шкарпэткі на батарэях у канцылярыі Ландсбергіса. Смурод быў жудасны. Тым самым я несьвядома ўзмацніў фэрмэнт азіятчыны ў літоўскай культуры, прытармазіўшы яе адаптацыю да эўракаштоўнасьцяў. Але самы антыэўрапейскі акт я адкінуў у жніўні 91-га ў Піцеры, калі Сабчак дарučыў нам, анархістам, абараняць Ленсавет ад танкаў ГКЧП з боку вуліцы Герцэна. Той плот, які мы за пяць хвілін разбурылі, будуючы барыкаду, безумоўна, належаў нейкаму эўрапейскаму бізнэсоўцу — удзельніку варшаўскага эканамічнага форуму, патэнцыйнаму інвэстару ў польскую гаспадарку.

Падобныя дэлікты зрабілі і мае сябры па дэпартацыі. Ніводны зь іх ніколі ня меў ніякіх праблемаў з заканадаўствам у Польшчы або ЭЗ, затое ўсе пагалоўна — з айчынным рэжымам: за пікеты, дэма, улёткі… Дык вось дзе закапаны сабака эўрафобіі!

У такім разе разумею расчараваньне арганізатараў саміту тым фактам, што на варшаўскі форум не прыехаў прэм'ер Сідорскі, аднак абсалютна не разумею фразы Квасьнеўскага падчас адкрыцьця форуму: «Сучаснымі зьменамі мы абавязаны мужнасьці апазыцыі…»

А ўвогуле, усё было здорава. І за мяжой пабывалі, і сłановы дазьняк адрэналіну атрымалі, і, нарэшце, склалі свой імідж аб ЭЗ. Распавядаць мне цяпер аб эўрапейскім парадызе — усё роўна што былому вязьню ГУЛАГу трындзець аб дасягненьнях сталінізму. Якімі б статыстычнымі дадзенымі пра рост чыгуну і сталі на душу насельніцтва вы яго ні грузілі, Сталін для яго заўседы будзе азначаць турэмную баланду, злых сабакаў і вертухая на вышцы. Гэтак і для нашай кампаніі — усе прагоны Статкевіча пра заможнае і свабоднае жыцьцё ў ЭЗ захінае малюнак ужо амаль роднай камэндатуры ў Тэрэспалі і ідыёцкі дыялог: «Адпусьціце». — «А мы вас і не затрымлівалі». — «Тады мы можам ісьці?» — «Гэта забаронена».

**Лёлік Ушкін**

# Разьяднаньне Эўропы

**Мяжу паміж Менскам і Вільняй правёў Сталін. Ніколі раней яе не існавала. Эўропа не сканчаецца на мяжы, праведзенай Сталіным. «Бэрлінская сьцяна» паміж Эўразьвязам і яго ўсходнімі суседзямі — зьява абсурдная, але ж спатрэбяцца гады для яе разбурэньня. Да сапраўднага аб'яднаньня Эўропы яшчэ вельмі далёка.**

Праведзены на Кіпры рэфэрэндум па аб'яднаньні вострава прынёс нечаканыя вынікі: большасьць кіпрыётаў прагаласавала супраць пляну аб'яднаньня, прапанаванага ААН. Нечаканьне да злучэньня грэцкае і турэцкае частак выспы выказалі грэцкамоўныя кіпрыёты (супраць — 75,8%), у той час як турэцкамоўная грамада ў сваёй большасьці падтрымала ўзьяднаньне (64,9% за). Адмоўныя вынікі рэфэрэндуму маюць свае наступствы і для Беларусі.

Як вядома, Кіпр належыць да краін, якія 1 траўня далучыліся да Эўразьвязу. Але ж праз наяўнасьць падзелу вострава на грэцкую і турэцкую часткі «выспа Афрадыты» ўяўляе сабой самы праблемны выпадак сярод краін-кандыдатак. Канфлікт паміж грэцкамоўнымі і турэцкамоўнымі кіпрыётамі мае больш чым 30-гадовую гісторыю і дайшоў да свайго апагею ў 1974 г., калі войскі Турцыі акупавалі паўночны Кіпр, каб перашкодзіць магчымаму аб'яднаньню вострава з Грэцыяй. З таго часу Грэцыя і Турцыя абвінавачваюць адна адну, хто зь іх больш замінае вырашэньню канфлікту. Так ці інакш, востраў быў падзелены на міжнародна прызнаны грэцкамоўны Поўдзень і непрызнаную турэцкамоўную Поўнач, дэмаркацыйная лінія паміж якімі ахоўвалася салдатамі ААН.

Зразумела, што афіцыйны Брусэль з пачатку перамоў пра ўступленьне Кіпру ў Эўразьвяз імкнуўся спрычыніцца да скасаваньня падзелу. Сьпярша лягічнай умовай уступленьня вылучалася безумоўнае аб'яднаньне выспы. Але ж сытуацыя зьмянілася ў 1999 г., калі Грэцыя і Брусэль пагадзіліся на «кампрамісны варыянт»: Грэцыя ня будзе блякаваць уступленьня Турцыі ў Эўразьвяз, а Брусэль адклікае сваё патрабаваньне пра аб'яднаньне Кіпру. Залішне казаць, што вырашэньне сур'ёзных міжнародных канфліктаў паводле прынцыпу «гандлю каровамі» ня надта пасавала абліччу справядлівага міратворца, на якое прэтэндуе Брусэль. Акрамя таго, кампраміс прадэманстраваў, што ў Эўразьвяз можа ўступіць хто хоча, нават краіны, якія знаходзяцца ў стане грамадзянскай вайны. Важна толькі мець добрых лабістаў унутры Зьвязу (у выпадку Кіпру гэта была Грэцыя).

Але ж Брусэль спадзяваўся ў апошні момант усё-такі даць рады з аб'яднаньнем вострава. На ўгаворваньне кіпрыётаў (у першую чаргу грэцкамоўных) былі кінуты найлепшыя дыпляматычныя сілы як Эўразьвязу, так і ААН. Сам Генэральны сакратар ААН Кофі Анан паставіў сваю рэпутацыю на карту, асабіста ўзяўшы ўдзел у працэсе перамоваў. Але ўсё сталася інакш. Пасьля адмоўнага выніку рэфэрэндуму ў Эўразьвяз уступае толькі паўднёвая, грэцкая частка Кіпру, а дэмаркацыйная лінія робіцца мяжой Зьвязу. Гэтым самым падзел вострава юрыдычна замацоўваецца, а турэцкая частка Кіпру мае ўсе шанцы стаць новай незалежнай дзяржавай.

Правал аб'яднаньня Кіпру мае сур'ёзныя палітычныя вынікі як на глябальным, так і на эўрапейскім узроўні. Па-першае, кіпрская драма ставіць пад сумненьне эфэктыўнасьць «мяккага» стылю дыпляматыі, які, у адрозьненьне ад «унілатэралісцкіх» Злучаных Штатаў, спавядаюць Эўразьвяз і ААН. Цяпер усе заклікі заходнеэўрапейскіх пацыфістаў перадаць ААН кантроль над акупаваным Іракам будуць гучаць, мякка кажучы, непераканаўча. На Кіпры ААН у чарговы раз засьведчыла сваю недзеяздольнасьць, а Эўразьвяз — адсутнасьць волі, кампэтэнтнасьці і прынцыповасьці, неабходных для вырашэньня праблем нават у сваім уласным доме. Што праўда, распачатае Злучанымі Штатамі «будаўніцтва нацыі» ў Іраку таксама ідзе ня дужа гладка, але ж мусіць праходзіць у значна цяжэйшых умовах, і тым ня менш урэшце будзе пасьпяховым.

Па-другое, пашырэньне Эўразьвязу праз кіпрскі выпадак робіцца відавочна не аб'яднаньнем, а разьяднаньнем Эўропы. Але ж Кіпр — не адзіны прыклад, калі ў выніку пашырэньня Зьвязу паўстаюць і ўмацоўваюцца межы там, дзе іх ніколі не было. Другі такі прыклад — мяжа паміж Беларусяй і Літвой. Цяпер, каб наведаць Вільню, беларусам патрэбна віза (умацаваньне мяжы Зьвязу было ўмовай уступленьня). Ненатуральнасьць граніцы на Кіпры і паміж Менскам ды Вільняй можна параўнаць з падзелам Нямеччыны на Захад і Ўсход, увасобленым у Бэрлінскай сьцяне. Мур паміж усходнім і заходнім Бэрлінам, які праіснаваў 28 год, стаўся сымбалем часовасьці існаваньня камуністычнай ГДР. Новая «Бэрлінская сьцяна» паміж Менскам і Вільняй ды на Кіпры — зьява таксама нелягічная і часовая, але ж спатрэбяцца гады для яе разбурэньня. Да сапраўднага аб'яднаньня Эўропы яшчэ вельмі далёка.

**Сяржук Вінаградаў**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Закладнік №1

**У сераду скончыўся тэрмін папярэдняга арышту экс-старшыні Менгарвыканкаму, экс-міністра замежных эканамічных сувязяў, экс-амбасадара ў Латвіі, Эстоніі ды Фінляндыі Міхаіла Марыніча. Нагадаем, сьледчыя КДБ абралі ў якасьці меры стрыманьня для Марыніча ўтрыманьне пад вартай. Што абвінавачаньне будзе прад'яўлена, сумневаў няма.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У сераду ж адбывалася і пасяджэньне адмысловай экспэртнай камісіі пры Радзе Бясьпекі, на якой разглядалася кожная паперка з тых, якія былі канфіскаваны з архіву на лецішчы Міхаіла Марыніча.

18 красавіка, нядзеля. На лецішчы Марыніча ў Зацені нехта выняў адну з аконных шыбаў. Гэта заўважыў сусед Марыніча. Па просьбе гаспадара суседзі пасьля беглага агляду дому адзначылі, што быццам бы ўсё на сваіх месцах. Міліцыі вырашылі не выклікаць.

20 красавіка. У кватэры Марыніча на пр.Машэрава раптам сталі дрэнна працаваць замкі.

24 красавіка, субота. Раніцай Марыніч заўважае, што ў ягоным аўтамабілі разьбіта шкло. Ён ідзе ў кватэру па грошы на новае шкло, аднак аказваецца, што ў хаце няма ні рубля. Каля 20.00 «Форд» Марыніча спыняе патруль ДАІ на вуліцы Арлоўскай у Менску. Пасьля праверкі дакумэнтаў запатрабавалі адчыніць машыну для надгляду асабістых рэчаў. Марыніч адмовіўся. На месцы зьяўляюцца апэратыўныя супрацоўнікі КДБ. Яны адчыняюць кейс, знаходзяць там 90 тыс. даляраў, а ў машыне — разукамплектаваны газавы пісталет. Марыніча вязуць у КДБ на размову.

25 красавіка, нядзеля. Да 4-й гадзіны раніцы перапісваюць нумары купюр, паралельна Марыніча распытваюць, адкуль грошы. Згодна з нашай інфармацыяй, яму нешта прапануюць, пакідаючы на роздум адны суткі. Супрацоўнікі КДБ прызначаюць Марынічу час сустрэчы, дадаючы, што ён мусіць прынесьці пацьвярджэньне таго, што гэта ягоныя грошы. У гэты ж дзень Марыніч ідзе на Сход інтэлігенцыі. Грошы, згодна з нашай інфармацыяй, прызнаюцца сапраўднымі.

26 красавіка, панядзелак. А 15-й Марыніч ідзе па грошы ў КДБ. Яго затрымліваюць. Пракуратура выдае санкцыю на вобшук на лецішчы, у кватэры, гаражы Марыніча. Увечары на лецішча прыяжджае апэратыўная група КДБ і праводзіць ператрус. У тым пакоі, дзе колькі дзён таму была вынята шыба, знаходзяць наразны пісталет гішпанскай вытворчасьці. Таксама канфіскуюць тэчкі з «сакрэтнымі матэрыяламі» з архіву Марыніча.

27 красавіка, аўторак. Старшыня КДБ Леанід Ерын афіцыйна пацьвярджае, што Марыніч затрыманы. На паседжаньні палаты прадстаўнікоў дэпутат Валеры Фралоў задае прэм'ер-міністру Сяргею Сідорскаму пытаньне аб прычынах затрыманьня Марыніча. Сідорскі адмаўляецца адказваць. А 19-й малодшы сын Марыніча Павал разам з маці, вярнуўшыся дадому, заўважае, што нехта ўваходзіў у кватэру. Замкі зачыненыя, але ня так, як звычайна. Да таго ж адчынены бальконныя дзьверы. У гэты ж дзень супрацоўнікі КДБ трасуць кватэру Ізабелы Марыніч — былой жонкі старэйшага сына Міхаіла Марыніча Ігара. Нічога не канфіскавана.

28 красавіка. Раніцай у КДБ былі выкліканы сыны Марыніча Павал і Ігар, а пасьля размоў зь імі сьледчыя правялі ператрус у гаражы Паўла. Паводле слоў Паўла Марыніча, ператрус працягваўся больш за тры гадзіны і завяршыўся канфіскацыяй некаторых дакумэнтаў арганізацыі «Дзелавая ініцыятыва», якой кіраваў (згодна з рашэньнем Мінюсту, нелегітымна. — **З.Д.**) Міхаіл Марыніч. Заяву ў абарону Марыніча прымае дэпутацкая група «Рэспубліка», а 12-й у «БДГ» праходзіць прэс-канфэрэнцыя дэпутатаў, а 15-й — акцыя дэпутатаў «Свабоду Марынічу!» ля цэнтральнага ўваходу ў КДБ. У гэты ж дзень за затрыманьне Марыніча адгукнулася латвійскае міністэрства замежных спраў: з 1999 да 2001 г. Міхаіл Марыніч працаваў амбасадарам Беларусі ў гэтай краіне. МЗС Латвіі распаўсюдзіла адмысловую заяву, у якой выказваецца асьцярога, што арышт Міхаіла Марыніча — гэта зьвядзеньне рахункаў рэжыму з палітычнымі праціўнікамі.

2 траўня БТ увечары ў сюжэце пра Міхаіла Марыніча паведаміла некаторыя падрабязнасьці ягонай справы. На БТ сьцьвярджаюць, што частка знойдзеных у Міхаіла Марыніча 90 тысяч даляраў нібыта фальшывыя. Таксама БТ паведаміла пра чатыры кампутары, знойдзеныя ў Марынічавым гаражы. Паводле тэлежурналістаў, знойдзеныя ў гаражы кампутары Міхаілу Марынічу перадала амэрыканская амбасада для стварэньня рэгіянальнай сеткі арганізацыі «Дзелавая ініцыятыва».

## Некаторыя высновы

Па-першае, зь сярэдзіны 90-х гадоў (а менавіта да гэтых часоў адносяцца «сакрэтныя матэрыялы») сьпіс дзяржсакрэтаў пасьпеў зьмяніцца. Па-другое, існуе паняцьце «састарэлыя сакрэты», якія на сёньня з розных прычын сакрэтамі больш не зьяўляюцца. Але калі хоць адна «грыфаваная» паперка будзе прызнана таямніцай, небясьпечнай для існаваньня дзяржаўнага ладу, Марыніч сьвецяць артыкул 377 ч.2 КК «Выкраданьне або пашкоджаньне дакумэнтаў асаблівай важнасьці, выкарыстаньне якіх можа нанесьці істотную шкоду дзяржаве» (штраф ці арышт на тэрмін да шасьці месяцаў, абмежаваньне ці пазбаўленьне волі на тэрмін да 5 год). Марыніч казаў, што зьбіраўся з дапамогай гэтых дакумэнтаў пісаць уласныя мэмуары. Вядома таксама, што за тыя гады, калі гэтыя паперы знаходзіліся на лецішчы Марыніча, іх ніхто не шукаў. Разам з тым вядома, што, калі міністэрства замежных эканамічных сувязяў ліквідавалі, аб'яднаўшы зь Міністэрствам замежных спраў, яго архіву не прынялі, бо ў архіве МЗС не было месца. Тады былы міністар Міхаіл Марыніч і мусіў частку дакумэнтаў вывезьці на лецішча «для гісторыі». І вось ён у гэтую «гісторыю» трапіў.

Апроч гэтага, пры вобыску ў ноч на 27 красавіка на лецішчы Марыніча знайшлі гішпанскі наразны пісталет, а гэта ўжо артыкул 295 ч.2 — «Незаконныя дзеяньні ў адносінах да агнястрэльнай зброі» (папраўчыя работы на тэрмін да 2 год ці арышт на тэрмін да 6 месяцаў, абмежаваньне ці пазбаўленьне волі на тэрмін да 5 год з канфіскацыяй маёмасьці або безь яе). Родныя кажуць, што ў Марыніча быў разукамплектаваны газавы пісталет і ніколі не было агнястрэльнага.

Грошы ж Марынічу пазычыў «нейкі расеец», які нібыта «ня ведаў, на што дае». Тэлебачаньне паказала стужку, дзе Марыніч гаворыць, што грошы павінны былі пайсьці на падтрымку беларускіх дэмакратычных кандыдатаў у парлямэнт. Марыніч ня мог ня ведаць, што гэта забаронена беларускім заканадаўствам. Дзіўна, што на ТБ паказалі фрагмэнт допыту, што таксама забаронена. Узьнікае сумнеў, ці была гэтая стужка ўвогуле сапраўдная: змазаны відарыс, кепска чутны голас, зацёрты хронамэтраж. Калі сапраўдная — невядома, ці ў адэкватным стане на той момант знаходзіўся Марыніч.

Стужка выклікала рэакцыі апазыцыі: Васіль Лявонаў у інтэрвію радыё «Свабода» заявіў, што Марыніч «да гэтага» (маецца на ўвазе арышт і жорсткі псыхалягічны ціск) «быў не гатовы». А Ўладзімер Парфяновіч сказаў, што, калі пачуе ад самога Марыніча «тое самае», г.зн. што ён браў ад расейскіх бізнэсоўцаў грошы пад выбары, ён ад Марыніча адмяжуецца.

## Некаторыя вэрсіі

Палітычная. Усё робіцца дзеля таго, каб ён ня мог весьці палітычную дзейнасьць. Марыніч не выказваў жаданьня зноў балятавацца на прэзыдэнцкую пасаду. Але ў дзень арышту, 26 красавіка, у другой палове дня ён павінен быў сустрэцца з паслом адной з эўрапейскіх краін. Кажуць, апошнім часам Марыніч шукаў краіну, дзе маглі б быць распачаты крымінальныя справы супраць беларускага кіраўніцтва. Заканадаўства шэрагу краінаў прадугледжвае ў некаторых выпадках узбуджэньне такіх крымінальных спраў і выдачу ордэраў на арышт.

Эканамічная. Марыніч — чалавек з сувязямі, у тым ліку з патэнцыйнымі інвэстарамі, у тым ліку — замежнымі. Да таго ж ён чалавек з вопытам кіраваньня, такі сабе «беларускі Аркадзь Вольскі». А ў бізнэсе часьцяком менавіта вага пасрэдніка, які вядзе перамовы з інвэстарам, вызначае першапачатковыя аб'ёмы інвэстыцыяў. Марыніч, кажуць, працаваў апошнім часам якраз над тым, каб прыцягнуць у Беларусь людзей, гатовых укладаць у нашу эканоміку грошы. Арышт Марыніча — гэта захад уладаў да спыненьня працэсаў кансалідацыі палітыкаў, бізнэсоўцаў, дырэктарскага корпусу, кіраўнікоў рознага ўзроўню ў барацьбе за зьмену ўлады.

**Зьміцер Дрыгайла**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

Не адбыўся выступ рэдакцыі часопісу **«Дзеяслоў»** у Наваградку 16 красавіка: мясцовыя ўлады запатрабавалі ад арганізатараў сцэнар сустрэчы зь пераказам магчымых выступаў. У Мазыры 17 красавіка міліцыя ў больніцы затрымала групу баптыстаў, якія прыйшлі павіншаваць хворых зь Вялікаднем: **Леаніда Мартыновіча**, **Мікалая Крынца**, **Васіля Біласа** аштрафавалі за «арганізацыю несанкцыяванага мітынгу» на 20 базавых адзінак кожнага. Пры распаўсюдзе газэты «BY-zone» у Смалявічах затрымалі актывіста «Зубра» **Аляксандра Сяліцкага**. 21 красавіка ў Белаазерску ўлады не дазволілі **дэпутатам гарсавету** сустрэцца з выбарцамі ў будынку гарвыканкаму: падставай стаў прыезд прадстаўнікоў кааліцыі «5+». 22 красавіка забаранілі мітынг з удзелам **лідэраў кааліцыі** ў Наваполацку. Вярхоўны Суд Беларусі 22 красавіка зьліквідаваў 2 грамадзкія аб'яднаньні — **«Беларускі цэнтар канстытуцыяналізму і параўнальна-прававых дасьледаваньняў»** і **«Міжнародны інстытут палітычных дасьледаваньняў»**. Кіраўнік Слонімскай раённай арганізацыі ПБНФ **Іван Бедка** атрымаў 22 красавіка судовае папярэджаньне за ўжываньне «незарэгістраванай сымболікі» на мітынгу ў Дзень Волі. У Берасьці 22 красавіка пры распаўсюдзе партыйных улётак затрымалі сакратара абкаму ПКБ **Мікалая Шыкеля**. 23 красавіка органы Дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў КДК прызналі кіраўніцу Беларускага Хельсынскага камітэту **Тацяну Процьку** падазраванай у крымінальнай справе па ўхіленьні ад падаткаў з сродкаў, вылучаных у рамках тэхнічнай дапамогі праграмы TACIS. 24 красавіка па аналягічным абвінавачаньні завялі справу на кіраўніка слонімскага ГА «Воля да разьвіцьця» **Міхася Варанца**. На рынку Ліды 25 красавіка затрымалі **Ўладзімера Леванеўскага**, у якога забралі некалькі сотняў бюлетэню «Предприниматель». 29 красавіка яго, а таксама **Зьмітра** й **Кацярыну Леванеўскіх** затрымалі на гарадзенскім рынку «Карона» падчас раздачы ўлётак. Іхнага бацьку **Валера Леванеўскага** затрымалі ў Горадні 1 траўня і асудзілі на 15 дзён арышту за распаўсюд улётак. У.Леванеўскі 3 траўня быў асуджаны на 13 сутак арышту за арганізацыю несанкцыяванага сходу прадпрымальнікаў, а **Аляксандар Траян** — на 3 сутак за ўдзел у сходзе. 26 красавіка перад пачаткам «Чарнобыльскага шляху» асобы ў цывільным затрымалі актывіста ПБНФ **Андрэя Сухаверхага**. На акцыі затрымалі актывіста АГП **Андрэя Козела** (асуджаны на 7 дзён арышту). За арганізацыю акцыі асудзілі актывістку АГП **Людмілу Гразнову** (225 б.в., або каля 1900 даляраў) і намесьніка старшыні ПБНФ **Алеся Міхалевіча** (10 дзён арышту). У Віцебску 26 красавіка затрымалі ўдзельнікаў чарнобыльскай акцыі: актывістаў ПБНФ **Улада Токарава**, **Кастуся Смолікава**, **Сяргея Шапіру**, **Алеся Янушкевіча**, актывістаў АГП **Алену Залескую**, **Элу Канавалаву**, **Уладзімера Семенчукова**, сябра КХП-БНФ **Яна Таўпыгу**, а таксама **Юрася Сьцяпанава**, студэнта **Кастуся Кузьняцова** й пэнсіянэрку **Розу Пушкарову**. Удзельнікаў той акцыі — актывістаў АГП **Фёдара Бакунова** і **Сяргея Катушова** — пасьля зьбілі невядомыя: з страсеньнем мозгу абодва трапілі ў бальніцу. 26 красавіка КДБ затрымаў кіраўніка ГА «Дзелавая ініцыятыва» **Міхаіла Марыніча**, якога абвінавачваюць у крадзяжы афіцыйных дакумэнтаў і захоўваньні зброі безь ліцэнзіі. Намесьніка старшыні ГА прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» **Зьмітра Іваноўскага** 27 красавіка пакаралі 15 суткамі арышту за ўдзел у несанкцыяваным вулічным сходзе прадпрымальнікаў. 26 красавіка Менскі гарадзкі суд адхіліў касацыйную скаргу газэты **«Народная воля»** наконт прысуду ў працэсе супраць Сяргея Атрошчанкі. Пры канцы красавіка недзяржаўную гомельскую газэту **«Вольны час»** адмовіліся друкаваць 3 друкарні — «Тытул» (Рэчыца), «Палесдрук» (Гомель), «Сьветач» (Менск). 1 траўня падчас сьвяткаваньня Дня працы былі затрыманыя актывісты моладзевых арганізацыяў **Юлія Гарачка** («Зубр»), **Зьміцер Дашкевіч** («Малады фронт»), **Васіль Парфянкоў** (БПС), **Павал Гормаш** і **Мікіта Красноў** («Маладыя сацыял-дэмакраты»). З.Дашкевіча асудзілі 3 траўня на 15 сутак за «Чарнобыльскі шлях». 3 траўня актывісты віцебскага прафсаюзу прадпрымальнікаў **«Пэрспэктыва»** даведаліся, што іх арганізацыя зачыненая пракуратурай месяц таму.

**АШ**




АРХІЎ МГА «КОЛА СЯБРОЎ»

# Магілёўскія шыльды

У Магілёве ў старым горадзе побач з афіцыйнымі назвамі некаторых вуліц зьявіліся шыльды, якія нагадваюць пра іх гістарычныя імёны. Так, пад шыльдай «вуліца Лібкнэхта» вісіць дапаўненьне: «завулак Пажарны. Гістарычная назва». Адметна, што большасьць старых магілёўцаў менавіта так і называюць гэтую вуліцу. І гэта вельмі радасна. Затое вось чуткі, што вуліцу Ленінскую пераймянуюць у вуліцу Міколы Гусоўскага, пакуль што так і застаюцца чуткамі. Акрамя таго, зьявіліся дзьве новыя шыльды, якія сьведчаць пра колішнюю прысутнасьць у Магілёве расейскай імпэратрыцы Кацярыны II і аўстрыйскага імпэратара Іосіфа II. Што праўда, да земляў Рэчы Паспалітай яны выяўлялі зусім не турыстычны інтэрас. Пра гэта шыльды маўчаць.

**Антон Вішоў, Магілёў**

# Калісь будавалі, цяпер рэстаўруюць

**Тысячы беларусаў-«гастарбайтэраў» працуюць цяпер на неабсяжных абшарах Расеі. Сярод іх ня толькі прадстаўнікі масавых будаўнічых прафэсіяў. Падзарабляюць там на пристойнае жыцьцё й людзі творчыя.**

Напрыклад, вядомы мастак Алесь П. расьпісаў на замову шыкоўныя сучасныя «церамы» ў Маскве, зразумела ж, не на беларускія, а на антычныя сюжэты. І ўсё ж большасьць нашых суайчыньнікаў занятыя будаўніцтвам катэджаў-палацаў для «новых расейцаў». Але ёсьць і тыя, хто працуе на рэстаўрацыі шматлікіх помнікаў даўніны, якая вядзецца, асабліва ў сталіцы Расеі, досыць шпаркімі тэмпамі.

У апошнія гады пачалося аднаўленьне Круціцкага Патрыярхавага падвор'я ў Маскве — выдатнага помніка архітэктуры другой паловы XVII ст. Асаблівую ўвагу прыцягвае «церамок» над брамай, увесь фасад другога паверху якога пакрыты цудоўнай паліхромнай маёлікай. Адметна, што аздаблялі яго беларускія майстры — знакамітыя ценінікі Сьцяпан Палубес ды Ігнаці Максімаў.

За Саветамі будынкі падвор'я выкарыстоўваліся пад гаўптвахту ды фондасховішчы Гістарычнага музэю. Здымаліся тут і асобныя сцэны гайдаеўскай камэдыі «Іван Васілевіч мяняе прафэсію». Пры канцы 80-х Круціцкае падвор'е было вернута Маскоўскай патрыярхіі.

І вось цяпер, як і ў другой палове XVII ст., на ім ізноў гучыць беларуская мова, ды не трасянка, бо сярод будаўнікоў-рэстаўратараў з Воршы і Барані ёсьць сапраўдныя сьвядомыя беларусы. Хоць яны прасілі не называць іхных прозьвішчаў, усе маюць у Маскве рэгістрацыю (якая, праўда, не дае поўнай гарантыі ад прыдзірак міліцыянтаў) ды неблагія заробкі.

Адно засмучае, што і на радзіме працы рэстаўратарам хапіла б надоўга. У Воршы патрабуюць тэрміновага аднаўленьня жылы будынак Куцеінскага Багаяўленскага манастыру, калегіюм езуітаў, кляштар базылянаў… Толькі вось заможных гаспадароў у нашых помнікаў архітэктуры няма, як няма і сродкаў на іх аднаўленьне. Таму і даводзіцца нашым вопытным будаўнікам-рэстаўратарам шчыраваць на чужыне. Суцяшае, што тое ж Круціцкае падвор'е — ня толькі расейска-беларуская, але й сусьветная культурная спадчына, для якой няма межаў і забыцьця.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

## Старых зэкаў схаваюць у лесе

Ля вёскі Якаўлевічы (Аршаншчына), на тэрыторыі былой вайсковай базы, у найбліжэйшы час адкрыецца незвычайны дом-інтэрнат. У ім будуць утрымлівацца былыя асуджаныя, якія, праседзеўшы ў турмах па 35—40 гадоў, пры канцы жыцьця засталіся безь сям'і і жытла. А такіх у Воршы, дзе да нядаўняга часу было тры турмы (у тым ліку найбуйнейшая ў Эўропе УЖ 15/8), шмат.

Новая ўстанова разьлічана на 50 месцаў, і ўжо да пачатку траўня сюды плянуюць перасяліць 40 былых асуджаных, якія цяпер жывуць у раённым доме для адзінокіх пэнсіянэраў ды інвалідаў у мястэчку Бабінічы і прычыняюць ягоным законапаслухмяным насельнікам шмат клопату. У штаце новай спэцустановы, акрамя мэдыцынскага і абслугоўвага пэрсаналу, прадугледжана служба аховы парадку. А каб былыя асуджаныя былі чымсьці заняты, на базе, разьмешчанай пасярод лесу, плянуецца аднавіць хлебапякарню ды завесьці гаспадарку. Толькі вось прыцягнуць да працы на іх састарэлых зэкаў наўрад ці ўдасца, калі ўсё сваё жыцьцё яны ня дужа жадалі працаваць.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## З Старога Быхава

Паблізу цэнтральнага гарадзкога рынку сьпілавалі векавыя ліпы, якія нібыта заміналі правесьці новую лінію электраперадач. 120-гадовыя дрэвы былі часткаю былой алеі памешчыка Залескага і зьяўляліся цудоўным напамінам сучасьнікам пра колішні, адрозны ад сёньняшняга, выгляд места.

**Васіль Журомскі, Стары Быхаў**

## У Слуцку зьніклі палаткі

Прадпрымальнікі, чые брызэнтавыя палаткі знаходзіліся на пляцоўцы ля чыгуначнага і аўтавакзалаў Слуцку, згодна з рашэньнем гарадзкіх уладаў спынілі сваю дзейнасьць. Ад чаго 25 чалавек, а гэта пераважна маладыя жанчыны — наёмныя прадаўцы, страцілі работу і трапілі ў сьпіс беспрацоўных, у якім ужо налічваецца звыш 1800 чалавек. Прычына закрыцьця? Яны, маўляў, «ня ўключаны ў пералік месцаў дысьлякацыі аб'ектаў гандлю», — так запісана ў тым рашэньні.

Пад такое закрыцьцё трапілі і тры ці чатыры палаткі індывідуальных прадпрымальнікаў, чые работнікі шчыравалі не адзін год на пляцоўцы паміж унівэрмагам «Слуцак» і Домам быту. Пакрыўджаным людзям улады паабяцалі месца на новым гаразкім рынку на тэрыторыі былога вайсковага гарадка. Але там яшчэ нават пляцоўка не заасфальтавана.

Колькасьць прадпрымальнікаў скарацілася з пачатку году ў краіне на 716 чалавек. Колькасьць малых прадпрыемстваў у Беларусі застаецца самай нізкай у Эўропе і складае 2,6 на 100 тысяч насельніцтва, у той час як у Расеі — 6,5, у Эўразьвязе — 45.

## 15 фэрмэраў на ўсю Случчыну

Ва ўрадлівым Слуцкім раёне, дзе ў вёсках пакуль пражывае звыш за 34 тысячы чалавек (60% зь іх — пэнсіянэры), налічваецца ўсяго 15 рэальна дзейных фэрмэраў, якія валодаюць 520 га зямлі. Самы буйны надзел — 103 га, самы дробны — 3 га. На падворках фэрмэраў налічваецца ўсяго 80 сьвіней і 33 галавы быдла. Некаторым фэрмэрам два гады таму давялося збыць на мясакамбінат завадзкіх удойных кароў толькі праз тое, што сыраробны камбінат па паўгоду не разьлічваўся зь імі за прададзенае малако.

За апошнія 13 гадоў, калі перад селянінам-калгасьнікам нарэшце адкрылі «шлюз» да права быць вольным на сваёй зямлі, колькасьць фэрмэраў нітрохі не зьмянілася. Людзей адпужвае незавершанасьць у краіне зямельнай рэформы. А яшчэ тармозіць гэты працэс выпешчаная ў людзей за дзясяткі гадоў панаваньня калгаснага ладу звычка жыць у чаканьні поклічу брыгадзіра, загадчыка фэрмы, старшыні калгасу — што і дзе рабіць.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Небясьпека ў храме

Яшчэ не закончана будаўніцтва Сьвята-Траецкай царквы ў Круглым, а работнікі МНС ужо б'юць трывогу. У аснову купалу пакладзена бярвеньне, якое не адпавядае стандартам: выкарыстаны верхавіны дрэў, якія прагнуліся ўжо цяпер, да ўстаноўкі купалу. Дэпутат райсавету рыхтуе запыт у адпаведныя службы, а калі гэта не дапаможа — дык і прэзыдэнту краіны, каб не паўтарылася краснапольская трагедыя. Між тым, храм плянуюць адчыніць да парлямэнцкіх выбараў, тым больш што спонсарам выступае дэпутат палаты прадстаўнікоў.

**Зінаіда Мілешчанка, Круглае**

## Полацкая культурная палітра

21 красавіка ў Полацку адбыўся спэктакль Віцебскага абласнога драмтэатру імя Якуба Коласа. Акторы паказалі пастаноўку паводле п'есы Андрэя Курэйчыка «П'емонцкі зьвер». Летась гарадзкія ўлады заявілі, што ў Полацку мусіць быць свой прафэсійны тэатар. А да таго часу, пакуль новы тэатар не паўстане як самастойны творчы калектыў, штомесяц у Полацку будуць выступаць «коласаўцы». Гэтая навіна актывізавала тэатральнае жыцьцё старажытнага гораду. Мясцовыя самадзейныя тэатры пачалі часьцей радаваць полацкіх аматараў Мэльпамэны прэм'ерамі. 22 красавіка сваю новую пастаноўку вынес на суд палачанаў моладзевы тэатар-студыя «Гармонія», які ўзначальвае рэжысэрка Валянціна Нагорная. Спектакль называецца «Каралеўская карова», аўтары п'есы — Л.Цітова і А.Стараторскі. У Полацку ў красавіку праходзіў таксама XVII Міжнародны фэстываль старажытнай і сучаснай камэрнай музыкі.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Кубак імя Некрашэвіча

У Бялынічах адбыўся турнір па міні-футболе на пераходны кубак памяці былога старшыні Рады гарадзкой суполкі ТБМ Сяргея Некрашэвіча. Сяргей Некрашэвіч быў вядомы ў горадзе ня толькі як грамадзкі дзяяч, але і як заўзяты аматар футболу. Менавіта таму летась пасьля гібелі Некрашэвіча сябры ТБМ вырашылі заснаваць футбольны турнір у ягонь гонар.

Сёлета 10 школьных камандаў прынялі ўдзел у спаборніцтвах, якія адбыліся ў мясцовай СШ №1. Выдаткі па арганізацыі і правядзеньні турніру ўзялі на сябе мясцовыя бізнэсоўцы. Пераходны кубак, які быў адмыслова выраблены для гэтага мерапрыемства ў Менску, атрымалі хлопцы з моладзевага шматпрофільнага цэнтру райаддзелу адукацыі. Заснавальнікі турніру вырашылі праводзіць яго штогод, каб далучаць моладзь да роднай мовы і здаровага ладу жыцьця.

**Ягор Клішэвіч, www.belngo.info**

# Мітынг з партрэтамі

**У Горадні 1 траўня самы цэнтар — Стары горад — скаланалі выгукі «Свабоду!», якія скандавалі сотні і тысячы людзей. Такога цікавага мітынгу ў Горадні даўно не было, а што датычыць «сьвята працы», дык увогуле ў такі дзень здарылася падобнае ўпершыню.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

Начальства заўсёды пільнае ў тым, што датычыць ідэалягічнай цнатлівасьці і адданасьці пыльным ідэалам. Каб нічога нечаканага і непрыемнага ня здарылася. Так было і сёлета. Начальства кіравала працэсам і панавала над сытуацыяй.

Незалежны прафсаюз самага буйнога прадпрыемства «Азот» каторым разам марна папрасіў гарадзкую ўладу дазволіць правесьці ўласны мітынг 1 траўня. І ўлада «пад капірку» штогод адказвала: сьвяткаваць не забараняем, але — разам з усімі, у межах афіцыйнага мерапрыемства. І сёлета сцэнар паўтарыўся. Ажно напярэдадні начальства перадумала і вырашыла зьмяніць тактыку дзеля ўратаваньня стратэгіі. Старшыню прафсаюзу і адначасова дэпутата гарсавету Сяргея Антусевіча раптам у другой палове дня 30 красавіка выклікалі ў выканкам і сказалі: дазваляем, праводзьце свой мітынг асобна, у іншым месцы (у Калоскім парку), а пра нашу ранейшую забарону забудзьце.

Сп.Антусевіч вымушаны быў іх расчараваць: рабочыя папярэджаны, прыйдуць на плошчу Леніна, як вы і сказалі. Рабочыя «Азоту» вельмі дарэчна аздобілі мітынг, узьняўшы высока-высока ажно чатыры бел-чырвона-белыя сьцягі зь літарамі «БНП» і два вельмі вялікія сьцягі аб'яднанай Эўропы. Начальства незадаволена паморшчылася, стоячы справа ад бронзавай статуі (калі глядзець з боку мітынгоўшчыкаў). Адно па-ранейшаму цешылі вочы сьцягі мясакамбінату на самым відавоку.

Самы галоўны абласны начальнік сп.Саўчанка, не зважаючы на папсаванае ўражаньне ад мітынговага пляцу, пачаў традыцыйную прамову. «Свабоду! Работу!» — выгукнуў пляц, сотні людзей пачалі пляскаць, сьвістаць, галёкаць. Займаліся яны гэтым, пакуль абласны кіраўнік ня скончыў. Ніхто нічога зь ягонай прамовы не пачуў. Гэтак жа адбылося і з наступнымі прамоўцамі са сьпісу, якія ня ведалі, чым замяніць свае ружовыя акуляры, і разгублена прытрымліваліся падрыхтаванага загадзя тэксту.

Потым начальства рэціравалася, пакінуўшы пайграць жыўцом духавы аркестар. Прыгнаныя на пляц школьнікі радасна разьбегліся, але палова пляцу чамусьці не разыходзілася. Усе былі ўражаны, прычым начальства — непрыемна. Пачалася неафіцыйная частка мітынгу, і як пачалася! Над галовамі ўзьняліся плякаты "У адстаўку!», «Годзе балбатаць! Надакучыў!», а таксама партрэты Аляксандра Рыгоравіча, ізноў жа з надпісамі — «Надакучыў! У адстаўку!». Пляц увогуле пачаў скандаваць: «У адстаўку!»

Ясна, што начальства паспрабавала дэманстраваць мускулы — узводы ў заплямленых мундзірах з гумовымі палкамі. Народ не сыходзіў з плошчы больш за дзьве гадзіны. Спачатку людзей было ня менш за тры тысячы, пазьней — дзьве.

Гэткае «стаяньне дзекабрыстаў» на пляцы скончылася больш вынікова, можна сказаць. Вялікая плойма рушыла на вул.Тэльмана, дзе ў пастарунку сядзеў затрыманы раніцай Валеры Леванеўскі, кіраўнік незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў. «Свабоду, свабоду!» — скандавалі людзі. А потым — «Леванеўскі, Леванеўскі!» і адразу «Іваноўскі, Іваноўскі!»: за дзьвесьце мэтраў у міліцэйскім спэцпрыёмніку сядзеў арыштаваны на 15 сутак актывіст прадпрымальніцкага руху Зьміцер Іваноўскі.

Міліцыя не прапусьціла на Тэльмана. Людзі зноўку скандавалі: «Свабоду! Свабоду!», — потым рушылі да спэцпрыёмніку, часова перакрылі вул.Сацыялістычную. І слова «свабода» гучала зноў і зноў. Адчувалася папросту эўфарыя, хай часовая. А Леванеўскага пратрымалі два дні ў «ізалятары» і далі таксама 15 сутак арышту.

**Сяргей Максімовіч, Горадня**

# Сьвята безь сьвятога

*Па тэлебачаньні ідзе рэпартаж зь першамайскай дэманстрацыі.*

*Карэспандэнт пытае ў рабочага:*

*— Зь якім настроем вы сустракаеце першамай?*

*Рабочы ў адказ:*

*— Ды пайшоў ты...*

*Карэспандэнт, зьвяртаючыся да тэлегледачоў:*

*— Вось так, з жартамі ды прыказкамі, сустракае народ першамай!*

(Анэкдот часоў перабудовы).

1 траўня ўжо адвячоркам вярталася зь вёскі. Ня слухаць магілёўскага радыё ў аўтобусе было немагчыма. Яно раўло на ўвесь салён штучна бадзёрымі галасамі:

— Ещё никогда на демонстрации не было так много народу!

Ну вядома, куды ж працоўны ад сьвята працы схаваецца! Дзе прымусілі, дзе дадатковую прэмію ў памеры 10 тысячаў выплацілі, адгул паабяцалі, дзе паставілі перад выбарам: альбо працуй на 1 траўня, альбо ўдзельнічай у дэманстрацыі. Дзень напярэдадні і два дні пасьля ў горадзе толькі й пляткарылі наконт таго, работнікі якога прадпрыемства выгадней на дэманстрацыю схадзілі. Кожны распавядаў, наколькі карысным было наведаньне дэманстрацыі для яго асабіста, а таксама для ягоных сваякоў, суседзяў, знаёмых.

— Я как директор школы могу сказать, что этот праздник очень любят наши дети. Они сами изъявили желание идти на демонстрацию! — ажно захлІпаецца ў мікрафон маладзіца ад жаданьня ў радыё трапіць.

20 гадоў таму, акурат пасьля першамаю, выхавацелька ў дзіцячым садку, мабыць, фармуючы ўяўленьне пра тагачасны навакольны сьвет, пыталася ў нас, шасьцігадовых, пра ўражаньні ад дэманстрацыі. Але мне й маім аднагодкам гэтае відовішча падалося незразумелым. Мы ня ўбачылі і не запомнілі ні халеры апроч чырвоных сьцягоў ды папяровых кветак. Затое ахвотна павядамлялі выхавацельцы пра ежу за сьвяточным сталом, пра гасьцей ды гасьцінцы і зь вялікім задавальненьнем на сьняданку стукаліся кубачкамі гарбаты, прамаўляючы чутыя ад дарослых тосты.

На цэнтральнай вуліцы Магілёва з назваю Першамайская, якраз пад вокнамі майго дому, заўсёды стаялі калёны дэманстрантаў. У чаканьні сыгналу да ўрачыстага шэсьця доўжылася не адна гадзіна. Прыбіральняў не было. Усе знаёмыя і калегі маіх бацькоў у такім выпадку беглі да нас. Падчас веснавой і восеньскай дэманстрацый дзьверы ў кватэры не пасьпявалі зачыняцца: бацькі працавалі на даволі буйным прадпрыемстве.

Паўдзельнічаць у афіцыйным сьвяткаваньні 1 траўня бадай што й не давялося. Бо паняцьці «першамай» і «пасадка бульбы» зрабіліся для мяне тоеснымі. З Магілёва да вёскі дабірацца далёка, як той казаў, к чорту ў зубы. Таму дзядуля з бабуляю амаль заўсёды садзілі бульбу на 1 траўня, каб дзеці і ўнукі маглі на падмогу прыехаць.

Расстаўіўшы мяхі з насеньнем па сотках, бацька, жартуючы, прывязваў да конскага хамута чырвоную стужку і загадваў усім на парад строіцца. Пры канцы 80-х дэманстрацыі паціху пачалі аджываць сваё.

— Это хорошо, что возрождаются старые традиции!

— Все мы от этого праздника становимся добрее, чище! — галёкаюць чарговыя ахвотнікі патрапіць у радыё.

Сёлета народнае гуляньне цягнулася да вечару ў звычайным фармаце. У сьметніцах квітнелі галінкі дрэў, аздобленыя капроновымі стужкамі. Пад маім акном на Першамайскай прадавалі ледзьве падпечаныя шашлыкі. Гарэлачка лілася ракою. А ў прыбіральню, як і дваццаць гадоў таму, бегчы не было куды. Адразу відаць — у нашай дзяржаве шануюць старыя традыцыі!

**Тацяна Барысік, Магілёў**

# Леванеўскі, Іваноўскі, Мамуль

## Прадпрымальніцкія лідэры Горадні: тры тактыкі

**У Горадні звыш за 9 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. Летась яны забясьпечылі паступленьне звыш як 13% бюджэту гораду, вытворчасьць 4% прамысловай прадукцыі і 7% — спажывецкіх тавараў. Аднак адносіны гарадзкіх уладаў і прыватных гандляроў назваць добрымі нельга. Праблемы апошніх вырашаюцца без уліку іх інтарэсаў. У час першамайскага мітынгу двое з трох гарадзенскіх прадпрымальніцкіх лідэраў сядзелі ў вязьніцы.**



**Нешматгучны мастак Зьміцер Іваноўскі стаў аўтарытэтным лідэрам дробных бізнэсоўцаў.**

«ДЕНЬ»

Сакавік—красавік выбухнуў шэрагам прадпрымальніцкіх акцый. Напачатку адбыўся «маўклівы» пратэст. На плошчы Леніна перад гарвыканкамам сабраліся чатыры сотні чалавек. Прадстаўнікі малога бізнэсу сваёй «гучнай цішынёй» патрабавалі палепшыць умовы разьвіцьця прадпрымальніцтва. Людзі ставілі подпісы пад зваротам да прэзыдэнта, нацыянальнага сходу і Савету міністраў. Патрабавалі адмены ліцэнзаваньня розьнічнага гандлю, нормы аб устаноўцы касавых сумуючых апаратаў у пасажырскім аўтатранспарце, наяўных нарматыўна-прававых актаў, якія перашкаджаюць разьвіцьцю прадпрымальніцтва, новых правілаў гандлю на рынках, калі любыя парушэньні цягнуць за сабой вялікія штрафы.

Адзіным пацярпелым у выніку мітынгу стаў намесьнік старшыні рэспубліканскага аб'яднаньня прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» Зьміцер Іваноўскі. Яго затрымалі напярэдадні акцыі. Ён меў пры сабе ўлёткі, якія запрашалі прадпрымальнікаў падтрымаць «маўклівы» пратэст. Сп.Іваноўскі адбыў дзесяць сутак адміністрацыйнага пакараньня за перавышэньне колькасьці друкаванай прадукцыі. Паводле закону можна да 300 экзэмпляраў…

26 сакавіка дзяржаўныя кантралёры зрабілі кантрольны закуп на рынку «Карона» і пачалі апісваць маёмасьць прадпрымальніка. За таварыша заступіліся іншыя. Прадстаўнікоў Дзяржкантролю, якіх абаранялі міліцыянты, выціснулі на вуліцу пад воклічы «Ганьба!».

У апошні дзень сакавіка дробныя прадпрымальнікі зноў сышліся каля гарвыканкаму. Напагатове былі міліцыя і АМАП. Размова доўжылася ў залі пасяджэньняў выканаўчага камітэту. Акрамя абяцанкаў нічога не прагучала. Падчас размовы многія прадпрымальнікі дэманстратыўна пакінулі памяшканьне.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Безапэляцыйнасьць і жорсткія палітычныя патрабаваньні Леванеўскага адштурхоўваюць ад яго частку прадпрымальнікаў.**

### Толькі адстаўка кіраўніцтва

Некалькі гадоў таму адзіным лідэрам гарадзенскіх дробных гандляроў быў кіраўнік агульнанацыянальнага страйкаму Валеры Леванеўскі. Неяк яму ўдалося сабраць на сход у адным з палацаў культуры звыш за 500 чалавек. Прадпрымальнікі падтрымлівалі сродкамі. Выходзяць дагэтуль бюлетэні «Право», «Наш город», «НПБ», «Избиратель», «Предприниматель», «Факел Прометея».

Валер'я затрымлівалі. Не пакідаюць яго ў спакоі і цяпер. Нядаўна склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні: ён нібыта вывешваў на дзьвярах шматкватэрнага дому, у якім жыве, аб'явы.

Міліцыянты затрымалі яго сыноў — студэнтаў Дзьмітрыя і Уладзімера. Хлопцы распаўсюджвалі на рынках лістоўкі з заклікам патрабаваць 1 траўня адстаўкі прэзыдэнта і ўраду. Такое рашэньне прыняў агульнанацыянальны страйкам Беларусі. Леванеўскі-старэйшы быў запрошаны на пасяджэньне адміністрацыйнай камісіі Ленінскага раёну гораду.

Леванеўскі мае ўласны сайт у Інтэрнэце. Тут ён рэжа праўду-матку — пра карупцыю ў міліцэйскіх і судовых органах, пра Лукашэнку, пра начную спробу зламысьнікаў пранікнуць у кватэру, пра парушэньні таямніцы перапіскі. Даслаў адкрытае пісьмо Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму паслу Расеі ў Беларусі.

Іншы раз адчуваньне меры ўсё ж падводзіць Валер'я Станіслававіча. Вось ён гаворыць, што менчукі падчас першамайскай дэманстрацыі рыхтуюцца закідаць прадстаўнікоў улады «тухлымі яйкамі і розным гнільлём»…

У горадзе зьявіліся новыя актывісты прадпрымальніцкага руху. Што гэтыя асобы маюць посьпех, можна меркаваць з чарговай улёткі Валер'я Леванеўскага. Ён абзывае канкурэнтаў правакатарамі, «засланцамі» КДБ ці БНФ, іх заклікі да дробных гандляроў — «трызьненьнем сівой кабылы». Асабліва закранула яго праведзеная акцыя «маўчаньня» («Прыйсьці пататпацца невядома чаго на цэнтральную плошчу, панаракаць на мясцовых чыноўнікаў, пазьбіраць подпісы, якія нікога ні да чога не абавязваюць, і г.д. Гэта называецца — выпусьціць пару… У іх ва ўсіх задача адна — адвесьці прадпрымальнікаў ад палітычных патрабаваньняў, ашукаць, забалбатаць, але не дапусьціць, каб прадпрымальнікі патрабавалі адстаўкі А.Лукашэнкі як галоўнага віноўніка галечы і беспраўя ўсяго насельніцтва Беларусі… Крыўдна за тых прадпрымальнікаў, якія паслухалі правакатара — папа Гапона… Хіба можна праводзіць такія акцыі? …Паважаныя прадпрымальнікі, калегі! Глядзіце, хто да вас прыходзіць, пацікаўцеся, хто ён! Чаго прыпёрся?»)…

Валеры Леванеўскі заклікае патрабаваць адмены ліцэнзій, абвязковага страхаваньня індывідуальных прадпрымальнікаў, штрафаў па фармальных і надуманых прыметах, зьніжэньня падаткаў. «Не выпрошваць трэба, а патрабаваць!»

Безапэляцыйнасьць і жорсткія палітычныя патрабаваньні Леванеўскага адштурхоўваюць ад яго частку прадпрымальнікаў. Дробныя гандляры ня хочуць сварыцца зь дзяржаўным чынавенствам, спадзяюцца на лепшае. Будзе яно ці не — іншае пытаньне.

### Не ў лабавую, а памалу

Зьміцер Іваноўскі таксама не навічок у грамадзкім руху. Арганізацыйную загартоўку атрымаў у Гарадзенскай гарадзкой арганізацыі грамадзкага аб'яднаньня «БНФ «Адраджэньне». Прафэсійны мастак, ён абіраўся намесьнікам старшыні. Пазьней палічыў, што партыйцу цяпер цяжка паразумецца зь беспартыйнымі прадпрымальнікамі. Ініцыяваў стварэньне незарэгістраванага дэмакратычнага руху «Гродзенскі выбар», старшынём якога зьяўляецца. Рэдагуе аднайменны інфармацыйны бюлетэнь, а таксама выданьне «Гродзенскі камерсант». Аднак аддае перавагу непасрэдным зносінам. Яго часьцяком можна бачыць на рынках Горадні. Да яго завітваюць дзелавыя людзі. Яму звоняць у цяжкі момант. Наладзіў адносіны з дэпутатамі-«рэспубліканцамі» Валер'ем Фраловым.

У адрозьненьне ад Леванеўскага Іваноўскі нешматгучны і не імпульсіўны. Яго паважаюць за тое, што трымае слова.

Яго крытыкуюць за ўдзел у «лятучках», якія праводзіў з прадстаўнікамі прадпрымальніцкіх колаў намесьнік старшыні аблвыканкаму Аляксандар Радзевіч. Маўляў, хадзілі, плакаліся аб праблемах. Начальнік слухаў, запісваў, ківаў галавой. Аднак гэтыя хаджэньні скончыліся нічым. Цяпер відавочна, што ўлада пайшла на перамовы, каб прыглушыць восеньскія выступленьні прадпрымальнікаў. Гэта ёй удалося.

«Мы таксама пабачылі, з кім маем справу, — кажа Іваноўскі. — Цяпер ніхто нас не папракне, што не шукалі іншых шляхоў паразуменьня. Мы адкрыта працягнулі руку дзяржаве, а нам плюнулі ў далонь. Адсюль і высновы…»

### Усім добрым ня будзеш

У тых сустрэчах удзельнічаў і старшыня зарэгістраванага ў 2000 г. Клюбу прадпрымальнікаў Франц Мамуль. У статуце гэтага грамадзкага аб'яднаньня пазначана — абарона правоў сваіх сяброў, прыцягненьне замежных інвэстыцый. Клюб паўстаў з ініцыятывы малых і сярэдніх прадпрымальніцкіх структур вобласьці. Мэты вылучаліся канкрэтныя — дасягненьне роўных умоў для ўсіх суб'ектаў гаспадараньня, падтрымка прадпрымальніцкіх структур у існым прававым полі, дапамога ў распрацоўцы бізнэс-плянаў. Кіраўнікі клюбу бяруць удзел у працы прэс-клюбу «Ініцыятыва», створанага ў Горадні паводле праекту Міжнароднай фінансавай карпарацыі (МФК) «Разьвіцьцё малога і сярэдняга бізнэсу ў Беларусі», пасяджэньнях Рады рэгіянальных аб'яднаньняў прадпрымальнікаў.

У свой час Клюб, разам з МФК, мясцовай уладай, цэнтрам падтрымкі прадпрымальнікаў «Бантон-Факс», ажыцьцяўляў праект «Залаты Мэркурый» — прысуджэньне грамадзкай прэміі ў галіне малога і сярэдняга бізнэсу. Франц Мамуль адзначыў тады добрае ўзаемадзеяньне з аблвыканкамам. Кіраўніка Клюбу прадпрымальнікаў цытавала абласная «Гродзенская праўда». У рэгіянальным выданьні «Биржа информации» зьявілася адмысловая старонка-спэцвыпуск. Да яе стварэньня спрычыніліся Гарадзенская гарадзкая арганізацыя АГП. Летась грамадзкае аб'яднаньне «Клюб прадпрымальнікаў» далучылася да супрацоўніцтва з праграмай «Альянс партнэрства Каўнтэрпарт» (САР). У Горадні павінен быць створаны грамадзкі клюб «Альянс».



«ДЕНЬ»

**Франц Мамуль перад пакутлівым выбарам**

Франца Мамуля запрашаюць на сустрэчы з магчымымі замежнымі інвэстарамі, якія на запрашэньні «вэртыкалі» наведваюць Горадню. Ён удзельнічае ў вызначэньні найлепшага прадпрымальніка вобласьці паводле вынікаў працы за год.

Клюб імкнецца наладзіць партнэрскія адносіны між уладай і прадпрымальнікамі Горадні. Аднак чынавенства выконвае дырэктывы, атрыманыя «зьверху», якія супярэчаць патрабаваньням малога і сярэдняга бізнэсу. Утрымацца на гэтых неспакойных хвалях і застацца незаангажаваным надзвычай цяжка. Трэба рашуча прымаць чыйсьці бок. Альбо стаць праўладнай грамадзкай структурай, альбо…

Кожнага з прэтэндэнтаў на лідэрства прадпрымальнікі ацэньваюць па ягоных справах.

**Антон Лабовіч**

## Тунэль пад Менскам існуе

Пішу ў сувязі з публікацыяй у апошнім нумары «НН» адносна гатэлю «Эўропа». Увагу прыцягнуў камэнтар сп.Уладзімера Дзянісава адносна тунэлю пад вуліцай Леніна. Дзеля інфармацыі хачу сказаць, што такі тунэль існуе насамрэч. У 1978 годзе я працаваў у аб'яднаньні «Летапіс» к/с «Беларусьфільм». Перад пачаткам будаўніцтва мэтро быў прабіты тунэль, які пачынаўся недзе ў раёне цяперашняй півярні «Старое рэчышча» на Першамайскай, а заканчваўся на Нямізе каля «Працоўных рэзэрваў». Па гэтым тунэлі павінна была пацячы Сьвіслач, калі мэтрабудаўнікі адкрытым спосабам зьбіраліся праходзіць яе каля парку Горкага. Мы тады здымалі так званы «архіўны матэрыял», апэратарам быў, калі не памыляюся, Анатоль Алай. Пазьней ад «паслуг» тунэлю адмовіліся. Тунэль той вялікага дыямэтру, прынамсі гарадзкі аўтобус мусіць прайсьці. Я асабіста разам са здымачнай групай спускаўся ў той тунэль у шахту, якая знаходзілася на рагу Леніна і Кірава, ля будынку суду. Кінастужка павінна зьберагацца ў архівах «Беларусьфільму». Так што калі тунэль той пашырыць, прапанова сп.Дзянісава робіцца цалкам рэальнай.

**Дзьмітры Падбярэскі**

## Жыць па-швэдзку

23—25 красавіка ў Пінску адбыўся беларуска-швэдзкі сэмінар «Камяні і ружы», арганізаваны ГА «Калегіюм» (Пінск) ды «Olof Palme International Center» (Стакгольм). Сэмінар праводзіўся для псыхолягаў, пэдагогаў ды студэнтаў з Горадні й Магілёва. Можна напісаць пра тое, што мэтай сэмінару было навучыць, як арганізоўваць працу зь дзяўчынкамі (цяпер мэтодыка пераносіцца й на хлопчыкаў) па вырашэньні праблемаў падлеткавага ўзросту. Можна расказаць, што ўдзельнікам тлумачылі і распавядалі пра тое, як падлеткам навучыцца вырашаць канфліктныя сытуацыі, як фармуляваць і бараніць свой погляд, як можна абмяркоўваць праблемы, што тычацца іх адносінаў, каханьня, стаўленьня да алькаголю і наркотыкаў. Але нельга на паперы перадаць атмасфэру, якая панавала на гэтым сэмінары.

Людзі, што дагэтуль або мала ведалі адно аднаго, або нават зусім былі незнаёмыя, за кароткі час, ужо ў першы дзень, сталі амаль што сябрамі. Стварылася атмасфэра даверу і ўзаемаразуменьня, цікавасьці і весялосьці. Выгляд чалавека, вопратка, узрост — усё адышло на другі плян. Кожны бачыў перад сабой Чалавека. Кожны быў сам сабой, не баючыся праявіць сваё «я», бо ведаў, што яго прымуць і палюбяць такім, якім ён ёсьць. Думаю, што гэта й было мэтай сэмінару. Каб пэдагогі па сабе адчулі дзеяньне праграмы «Камяні і ружы», распрацаванай швэдзкай арганізацыяй «WOCAD», і здолелі данесьці падлеткам — як трэба паводзіць сябе з аднагодкамі, як абараніць сваю думку і ня стаць ахвярай «агрэсара», як захаваць сваю індывідуальнасьць. Каб падлеткі не баяліся выказваць сваю думку, умелі абараніць яе і ў той жа час каб навучыліся слухаць іншага чалавека ды ўмелі прымаць яго погляды. Бо погляд кожнага чалавека мае права на існаваньне. Сэнс праграмы заключаецца ў тым, каб падлеткі самастойна дайшлі да ўсяго вышэйпералічанага. Пэдагог, які бярэ ўдзел у гэтай праграме, не павінен выконваць ролю настаўніка ці разумнага, дасьведчанага дарослага. Ён павінен быць незалежным каардынатарам, які арганізоўвае гульню і абмеркаваньне. Пры гэтым сам застаецца ў цені, толькі сочыць за дзеяй і пры патрэбе скіроўвае яе ў неабходнае рэчышча.

Як сказаў адзін з удзельнікаў сэмінару пасьля яго завяршэньня, цяпер па Беларусі пачнуць адгалінёўвацца «маленькія калегіюмы». Гэта значыць, што вопыт, набыты ў швэдаў, будзе пашырацца ў нашай краіне і хоць бы нейкая частка падлеткаў здолее даць рады сваім праблемам самастойна і разумна.

**Яўген Саляйчук, Пінск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## БАТЭ выйграе безь легіянэраў

Хацелася ў колькіх словах працягнуць тэму легіянэрства ў нашым унутраным чэмпіянаце па футболе, узьнятую Алегам Ждановічам у «НН» ад 9 красавіка.

Напярэдадні сёлетняга сэзону па футболе не паленаваўся ды палічыў колькасьць «варагаў» на нашых палях. Выйшаў 71 чалавек. Гэткай колькасьці гульцоў хапіла б на 3-4 каманды. Сярод нашых легіянэраў, паводле маіх падлікаў, аказаліся 33 расейцы, 22 украінцы, пяцёра грузінаў, трое малдаванаў, двое баўгараў, адзін чэх, альбанец, бразылец, узбэк, латыш і армянін. Між іншым, яшчэ маем чатырох расейцаў — галоўных трэнэраў каманд: Сяргея Падпалага, Пятра Шубіна, Армена Адамяна, Віктара Вярчова, якія працуюць адпаведна на «Гомель», менскае «Дынама», «Дарыду» і «МТЗ-РІПА». Берасьцейскае «Дынама» трэніруе латыш Віктар Несьцярэнка.

Можна пагадзіцца, што сытуацыя зь легіянэрамі ў нас яшчэ не такая катастрафічная, як у Туманным Альбіёне (часам у асноўным складзе «Глазга» не выходзіць ніводзін шатляндзец), аднак пэўныя небясьпечныя тэндэнцыі назіраюцца і на айчынных футбольных палёх. Надзвычай актыўна «ўсходняю палітыку» набыцьця гульцоў з Расеі і Ўкраіны сёлетняй зімой вялі «Гомель», «Дняпро-Трансмаш», «Нёман», «Дарыда», «МТЗ-РІПА». Гэткая стаўка на «прывазны тавар» спарадзіла невялікую дыскусію аб увядзеньні ліміту на легіянэраў, як гэта зроблена, напрыклад, у Казахстане. Кожны казахскі клюб мае права мець толькі пяць легіянэраў. Ці ня гэтае абмежаваньне спрычынілася да хуткага тэмпу разьвіцьця казахскага футболу? Цяперашнія клюбы з гэтай краіны ўдзельнічаюць у спаборніцтвах пад эгідай УЭФА.

Не бяды было б, каб да нас ехалі высокатэхнічныя гульцы, — беларусы гэтаксама масава зьяжджаюць на працу ў тыя самыя Расею ці Ўкраіну. Аднак выходзіць так, што замест найлепшага снайпэра леташняга чэмпіянату Сяргея Карніленкі, які зьехаў гуляць у кіеўскае «Дынама», мы атрымалі тузін іхніх паўпрафэсіяналаў, якія саступаюць узроўню нават нашых футбалістаў. Чаму так адбываецца? Адказ вельмі просты: купіць якогась другараднага расейца значна таньней, чым выхаваць уласную зорачку накшталт Бялькевіча ці Глеба. Дзіцячая футбольная індустрыя належным чынам пастаўлена толькі ў трох—пяці клюбах, астатнія й надалей будуць рабіць стаўкі на «варагаў».

Адзінай беларускай камандай, у шэрагі якой ня ўплішчыўся ніводзін легіянэр, сёлета сталася БАТЭ, флягман нашага чэмпіянату, які за шэсьць гадоў жыцьця ў вышэйшай лізе аніразу не застаўся без мэдалёў. Яскравы прыклад таго, што прызавы мэтал можна каваць выключна сваімі кадрамі.

Магчыма, некаму падасца, што я выступаю супраць усякіх легіянэраў увогуле. Не, ні ў якім разе. Такія гульцы, як расейцы Карсакаў і Навумаў, бразылец Эду ці баўгарын Злацінаў, толькі дадаюць непаўторнага калярыту нашаму першынству. Шкада, што гэткіх прыкладаў набралося ня так і шмат.

**Сяргей Панкавец, Кастрыца**

## Сёмуху ад Нератка

Шаноўны Васіль Сёмуха!

Хачу адразу папярэдзіць, што чалавек я ня вельмі вясёлы, але разумею гумар і сам люблю пажартаваць.

Адчуваю сябе вінаватым у Вашай злыбядзе і таму пастараюся хаця б неяк папраўляваць апраўдацца. Несумненна, што паміж мной і «ЛіМ»ам адбылося пэўнае непаразуменьне: я хацеў бы, каб былі падпісаныя тыя, хто жадае чытаць «ЛіМ», але абмежаваны ў сродках больш, чым я. Відавочна, лімаўцы не ўлічылі Вашага сацыяльнага статусу і (асабліва) сёньняшняй арыентацыі.

Аднак што зроблена, тое зроблена. І прыватная абвестка ў «Нашай Ніве» прымусіла мяне ня толькі зарагатаць на ўвесь тралейбус, а й задумацца: што ж мне рабіць, як выкручвацца зь недарэчнай сытуацыі, у якую паставілі мяне добразычлівыя зь «ЛіМу»?

Увогуле ў маіх дуроных глуздах заварушыліся адразу два варыянты: аформіць праз «ЛіМ» Вам падпіску на 2-е паўгодзьдзе; пайсьці з Вамі на абмен, прапанаваны ў абвестцы.

Пасьля некаторага роздуму першы варыянт быў адкінуты як бесчалавечны, таму праз «НН» вышлю грошы на выкшталцоную туалетную паперу. Зь сіламоц навязаным «ЛіМам» прапаную разабрацца так: пераадрасаваць яго мне як першапрычыне Вашага душэўнага неспакою (адрас у Рэдакцыі). Што рабіць, давядзецца мне чытаць «ЛіМ» два разы — за сябе і за Вас...

А калі сур'ёзна, то такі канфлікт сьведчыць, што ўсё ж ня сьлед уладам расстаўляць па розныя бакі барыкад творчых людзей: сьмешна выходзіць і сумна, а ўвогуле — сорамна.

Са шчырай павагай да Вас,

**Юрась Нераток, Менск**

## Не рубай хайкі!

Стараюся цікавіцца ўсімі навінкамі культурнага жыцьця. Нядаўна агледзеў у кнігарні зборнік «Літаратурны квартал». Сярод іншых ёсьць там вершы Сяргея Патаранскага. Некалькі зь іх называюцца дужа дзіўна — хайкі. Ну, думаю, халера на іх — мо «прыколваецца»? Бяру «Маладосьць» №3. І там Патаранскі. Чытаю: рубаі. І разумею, што зусім не «прыколваецца» сп.Патаранскі, а ня ведае, што правільна пісаць «хайку» й «рубаі».

**Раман Тумашык, Менск**

МОВА-2004

## Сеткаслоў, кратаванка

Прапаную, называючы сканворд, кіравацца яго выглядам. Ён нагадвае нейкую сетку або краты. Адпаведна атрымліваюцца два варыянты назвы: «сеткаслоў» або «кратаванка».

**Віталь Стахіевіч, Менск**

З ФОРУМУ НА WWW.NN.BY

**scjapanawic | 25.04.2004 | 10:59**

Легалу — на яго публікацыю ў «ЛіМе» ад 23.04. г.

Ня можаш, Лёня, угадаць,
Як тваё слова адзавецца? —
Мо хай яно зусім заткнецца;
Мо гэта й будзе — «благо-дать»?

**Янук | 23.04.2004 | 17:33**

Прачытаў у апошнім нумары чытацкі водгук «Рускае Сяло». Сам ведаючы ўзгаданыя мясьціны, хацеў бы дадаць пару словаў. Мае вёска й неафіцыйную, народную назву. Старыя людзі й маладзейшыя таксама ўжываюць яе: Рускасельле. Гутарыў зь некаторымі старымі жыхарамі гэтае вёскі і чуў цудоўны беларускі дыялект, які адыходзіць ужо пакрысе ў нябыт. Калі не памыляюся, летась ля гэтай вёскі перапахавалі парэшткі жаўнераў царскага войска, што знойдзены былі падчас гаспадарчых работаў (у часе першай сусьветнай вайны тут праходзіла лінія фронту). На месцы іхняга пахаваньня ўсталяваны вялікі бэтонны крыж з выяваю Збаўцы. Ён добра бачны, калі ехаць па шашы Вялейка—Смургоні.

**Новікава Аксана| 23.04.2004 | 14:39**

Артыкул пра «рэнэсанс папулізму» ў апошнім нумары газэты напісаны з поўным разуменьнем праблемы. «Наша Ніва» першая (прынамсі, у Беларусі) пісала ў свой час пра справу Хадаркоўскага і «Юкасу»: цар даў, цар і бярэ назад, чаго нам, простым сьмяротным, пра царскую справу разважаць! На мой погляд, гэта вельмі дакладная характарыстыка аднаго боку праблемы. Усе гэтыя набліжаныя да ўлады людзі, атрымаўшы ўсё ў свой час фактычна за бясплатна, кляліся тады жыць ледзьве ня надгаладзь, разьвіваючы на першым часе атрыманую імі вытворчасьць і павышаючы зарплату людзям, а потым ужо — сабе. Такі ход здаваўся лягічным, каб ня выклікаць незадаволеньня людзей, дый будучыя алігархі, калі кляліся, самі многія верылі, што так і будуць рабіць. Рэчаіснасьць з аб'ектыўных ці суб'ектыўных прычынаў аказалася трохі іншай. Першая прычына «рэнэсансу папулізму» заключаецца ў тым, што палітыкі ва ўсіх краінах былога савецкага блёку выкарыстоўвалі ў сваёй большасьці ўладу і блізкасьць да ўлады для вырашэньня матэрыяльных праблем і сваіх, і блізкіх ім людзей. Астатнім 80 працэнтам заставалася роля статыстаў і абыцакі. Але прэса таксама зрабілася менш залежнай, і яна ж з розных прычынаў першая расказала народам пра цяперашняе жыцьцё іх колішніх сумленных палітыкаў. З другога боку, шмат якія разумныя людзі глядзяць на ўсё гэта і кажуць: «А чаму ён, а ня я, атрымлівае падрады ад улады, напрыклад на будаўніцтва?» Што, разумнейшых за Алену Батурыну і г.д. людзей няма? Вось гэтыя людзі і спрабуюць узначаліць стыхійнае народнае незадаваленьне супраць аскандаленых палітыкаў першай хвалі.

Яшчэ адзін цікавы момант: польскі Сойм летась заклікаў ЗША ўвесьці бязьвізавыя стасункі з Польшчай. Калі адкінуць слоўнае шалупіньне, дык гэта было зроблена для таго, каб зваліць польскае 25-працэнтнае беспрацоўе на Штаты, а народу наказаць, што і яму ёсьць навар ад рэформаў — магчымасьць зьехаць працаваць у Амэрыку. Але ЗША адмовілі ў гэтай пранізьлівай просьбе. Эўропа ж афіцыйна яшчэ не дазволіла, але фактычна там ужо працуюць з абмежаванымі правамі сотні тысяч рознарабочых з усходу. Гэта дапамагае зьняць сацыяльную і іншую напружанасьць на радзіме гэтых рабацяг, але выклікае незадаволенасьць мясцовых жыхароў. Але думаю, што аб'яднаная Эўропа здолее праціснуцца паміж Сцылай і Харыбдай.

Высновa: пакуль алігархі, цяперашнія ці будучыя, пералічаныя у артыкуле краін не пачнуць па-сапраўднаму дзяліцца са сваімі народамі, гэтыя краіны, маючы ўсеагульнае выбарчае права, не застрахаваны ад любых паваротаў да ўладзе. Такія асабліваасьці цяперашняй пабудовы капіталізму.

**Вальжына | 17.04.2004 | 10:47**

Хачу дадаць свой камэнтар да аднаго з артыкулаў апошняга нумару, дзе вялося пра фільм Яна Шванкмаера «Палена», маўляў, яго нідзе ня можна дастаць... У колах маіх сяброў творчасьць Шванкмаера вядомая даўно, але нам папросту ПАШАНЦАВАЛА: сястра аднаго прыяцеля жыве ў Чэхіі і рэгулярна прывозіць адтуль цікавую музыку і кіно, а той патроху гэта памнажае і распаўсюджвае між знаёмых, тыя — між сваіх, і г.д. Абнавачваць журналіста ў тым, што ён ня мае гэткіх карысных знаёмстваў, не выпадае. Аднак DVD «Палена» можна купіць за 18 тыс. у Палацы мастацтваў: расейцы афіцыйна выдалі гэты фільм.

**чух | 16.04.2004 | 09:19**

Што да артыкулу «Эстэтычная глухата Мінюсту». Мне здаецца, што праблема там ня толькі ў «Пагоні». Рэч у іншым. На шыльдзе напісана «Саюз ПІСЬМЕНЬНІКАЎ Беларусі», тады як афіцыйная назва арганізацыі — «Саюз БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ». Адчуваеце розьніцу? Таму мне здаецца, што тут Мінюст мае рацыю і ня трэба яму закідаць, што ціпа яны нацыяналістаў і «Пагоню», хоць і па-мастацку афармлены, ня любяць.

**чуху | 16.04.2004 | 21:56**

А якая розьніца, пісьменьнікаў Беларусі ці беларускіх пісьменьнікаў? Што, ад такой шыльды нейкая шкода ці блытаніна? Тым больш што ўлада сама раз на пяць гадоў забараняе па чарзе то слова «Беларусь» ужываць, то слова «беларускі». Органы юстыцыі павінны дапамагаць арганізацыям і сачыць, каб яны шкоды грамадзтву не рабілі, а яны паслугачы лукашыстаў або самі лукашысты, думаюць, як бы болей народу прыдушыць. Увогуле, усё гэта прыдумаў нейкі Чаргінец, каб «Іслач» шантажом забраць.

## Зь Беларусі – у Эўропу

Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў, што сёлета скanчваюць 7—9 клясы сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзаменаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыбленa, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія.

Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі.

Распрацоўваюцца пляны стварэньня прыватнага Беларускага гуманітарнага ліцэю, у якім змогуць займацца навучэнцы ліцэйскіх курсаў, а таксама арганізацыі навучальнага працэсу за мяжой. Выпускнікі Ліцэю будуць мець магчымасьць атрыманьня бясплатных стыпэндыяў на навучаньне ва ўнівэрсытэтах эўрапейскіх краінаў.

**Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59.**

Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.

## Быкаў, Колас і Гамбровіч у «купалаўцаў»

Купалаўскі тэатар пачаў падрыхтоўку да прэм'ераў: Коласавага «Сымона-музыку» ставіць Мікалай Пінігін, а «Івонну» Вітальда Гамбровіча — Аляксандар Гарцуеў. У Польшчы 2004-ы абвешчаны годам Гамбровіча: пісьменьніку 100 гадоў. «Купалаўцы» маюць павезьці сваю пастаноўку ў Польшчу, на юбілейны фэстываль.

А 7 траўня на Малой сцэне тэатру мае адбыцца прэм'ера «Альпійскай баляды» паводле аповесьці Быкава.

## Галерэя «Янушкевічы»

У мястэчку Ракаве (Валожынскі раён) адкрылася прыватная галерэя «Янушкевічы» і музэй. Іх заснавалі браты Янушкевічы, самыя вядомыя зь якіх — скульптар Валяр'ян і мастак Фэлікс. Галерэя месьціцца побач з касьцёлам, апетым у «Народным альбоме». У галерэі на плошчы каля 500 кв.м разьмяшчаюцца творы братоў Янушкевічаў, а таксама іхных сяброў. Акрамя таго, тут можна пабачыць ракаўскую краязнаўча-гістарычную экспазыцыю — кнігі, керамічныя й шкляныя вырабы, польскамоўныя і нямецкамоўныя шыльды й дакумэнты. Самы каштоўны экспанат — падарожны працоўны столік Адама Міцкевіча, — адзін з продкаў Янушкевічаў працаваў у яго сакратарам. Гэта ўжо другі ў мястэчку музэй. Першы, прысьвечаны знакамітым літаратарам Ракаўшчыны, заснаваў іншы вядомы ўраджэнец Ракава — прафэсар Вячаслаў Рагойша.

## Дзіцячая кніга Жарнасек

У выдавецтве «Pro Christo» выйшла кніга Ірыны Жарнасек — аповесьць-казка для дзяцей «Спрэчка анёлаў». Пісьменьніца з Наваполацку, аўтарка кніг «Гадара» й «Гульні над студняй», рэдагуе дзіцячы каталіцкі часопіс «Маленькі рыцар Беззаганнай».

## Кіно пра габрэйскіх партызанаў

Дакумэнтальны фільм Фэлікса Кучара «Апошнія сьведкі» быў паказаны на I Варшаўскім міжнародным кінафэстывалі «Габрэйскія матывы». 40-хвілінная стужка распавядае пра габрэйскія партызанскія аддзелы пад камандаваньнем Шымона Зорына і Тэўе Бельскага, якія разьмяшчаліся ў Налібоцкай пушчы. Аддзелы складаліся пераважна зь вязьняў Менскага гета і габрэяў Заходняй Беларусі.

## Том для маладых рэвалюцыянэраў

«Што значыць сёньня быць паўстанцам? Хто зьяўляецца паўстанцам? Ці абавязкова для гэтага змагацца са зброяй у руках? Адказы на гэтыя пытаньні могуць быць самымі рознымі. Але цяпер размова не пра гэта. Перад вамі тыя, хто быў сапраўдным змагаром за лепшую долю. Тыя, хто прысьвяціў сваё жыцьцё Барацьбе. І абсалютна няважна, ці гэта было змаганьне са зброяй у руках, ці не. Паўстанец у любых умовах застаецца паўстанцам. Ты ў гэтым можаш пераканацца самастойна».

Гэта цытата з кнігі Тома Вэйга «Тэлелетуценьнікі — Фракцыя Чырвонага войска», што зьявілася (па-расейску) у гарадзенскіх кнігарнях. У ёй пададзена гісторыя руху з моманту стварэньня да поўнага яго зьнішчэньня. Створаны ў 1967 г., «Рух Фракцыі Чырвонай арміі» стаў прыкладам для рознага кшталту сацыяльных і анархічных рухаў у цэлым сьвеце. Наклад кнігі 3000 ас.

## Мэмуары «Агента-007»

Актор Шон Конэры, першы з галерэі славутых «Джэймзаў Бондаў», піша мэмуары. За правы выдаць аўтабіяграфію актора ўжо цяпер змагаюцца некалькі буйных выдавецтваў.

## «Палёт кондара» — нацыянальны набытак Пэру

Пэруанскі Нацыянальны інстытут культуры прызнаў мэлёдыю «Палёт кондара» культурным набыткам краіны. Гэтую інструмэнтальную п'есу паводле матываў індзейскіх мэлёдый напісаў пэруанскі кампазытар Даніэль Алёмія Роблес (1871—1942).

**Адам Воршыч, Васіль Кроква, Андрэй Мялешка; радыё «Свабода», Gazeta.pl**

# «Крамбамбуля» са Скрыпкам


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ


«КП»

**21 траўня ў КЗ «Менск» адбудзецца супольны канцэрт «Вопляў Відаплясава» з шоў-праектам «Крамбамбуля».**

Як нам паведаміла прадусарка «Каралёў раёну» Ганна Вольская, ідзе праца над сынглам, у які ўвойдуць новыя песьні з будучага «Сьвяточнага альбому» («23 февраля» і «Дарагія жэншчыны»), а таксама з «Крамбамбулі ўсходняй» ды некалькі песень, сьпетыя з Алегам Скрыпкам. Алег прасьпявае з Вольскім «Песьню суседзяў» і «Песьню турыстаў». Уласна, у КЗ адбудзецца прэзэнтацыя гэтага міні-альбому з удзелам Вольскага, Кулінковіча, Абасавай і Міхалка (хоць ягоны ўдзел яшчэ пад пытаньнем). Натуральна, прагучаць старыя гіты («Госьці», «Абсэнт», «Бэля»). Вядуцца перамовы з цыркачамі, што маюць паказаць шоў. Потым гледачоў чакае вялікі сольны канцэрт украінскіх гасьцей. Пачатак «інтэрнацыянальнага шоў» а 19-й. Квіток каштуе 12000—50000.

**Сяргей Будкін**


AP

## Пасьля Хрыста — сьвяты Францішак

Манахі-францішканы прапанавалі Мэлу Гібсану зьняць чарговую стужку на рэлігійную тэму — пра жыцьцё Францішка Асыскага. Ліст з гэтай просьбай быў зьмешчаны на афіцыйным сайце Ордэну ў Інтэрнэце. Вобраз сьвятога Францішка ўпершыню быў увасоблены на кінаэкране ў нямым фільме ў 1929 г. Акрамя таго, у 1972 г. стужку, прысьвечаную яму, зьняў Франка Дзэфірэлі.

**АШ**

# Драматургі-эўраазіяты


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Ляўрэатамі II Міжнароднага конкурсу п'есаў «Эўразія-2004» (Екацярынбург, Расея) сталі тры беларускія драматургі. Андрэй Курэйчык (на здымку) з п'есай «Тры Жызэлі» атрымаў 3-е месца ў намінацыі «П'еса на вольную тэму», а ўладальнікамі спэцпрызоў журы сталі актывіст «Хартыі-97» Мікалай Халезін («Я прыйшоў») і Павал Пражко, які працуе пад псэўданімам Афрадыта Дубавік («Сэрпантын»).**

БІБЛІЯТЭКА ЛЯВОНА БАРШЧЭЎСКАГА

# Колькі вечных строфаў



**12+1: Конкурс маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай** / Прадмова Ганны Кісьліцынай, укладаньне й пасьлямова Андрэя Хадановіча. — Менск: Логвінаў, 2004

Нехта з клясыкаў калісьці напісаў, што калі яму ўдасца пакінуць пасьля сябе хоць бы страфу сапраўднай паэзіі — значыць, жыцьцё не было пражыта марна. Удзельнікі леташняга конкурсу маладых літаратараў, арганізаванага ПЭН-Цэнтрам, мелі ад шаснаццаці да дваццаці пяці вёснаў за плячыма. Банальнасьцю было б гаварыць «У іх усё наперадзе». Але здаецца, у гэтых юнакоў і дзяўчат ужо ёсьць кавалкі строфаў, што зьвяртаюць на сябе ўвагу:

...На пальцы праліваецца трава,
і нават нежывыя прагнуць жыцьц.
(*Віка Трэнас*).

В начале было <Нрзб>.
(*Дзьмітры Дзьмітрыеў*).

...Нечым сапраўдным, ружовым
Пахне ў дзьветысячыновым...
(*Юлія Шастак*).

У Глеба Лабадзенкі й Арцёма Арашонка ўдаліся трохрадкоўі, якія наагул пішуць усе, абзываючы іх словам «хайку», а запамінальнымі робяць адзінкі.

Дзяўчына нясе
Кветак палявых ахапак...
Пылок на грудзях.
(*Арцём Арашонак*).

Прыстойна выглядаюць зьмешчаныя ў кніжцы празаічныя творы — імпрэсіяніcцкі ў Вальжыны Морт («Гопнікі»), экспрэсіяніcцкі ў Крысьціны Курчанковай («Перакулены келіх нябёсаў»), постмадэрнавы ў Анатоля Івашчанкі («Флейта дажджу»). Наагул, знаёмства з творамі каторага з маладых паэтаў раз-пораз суправаджаецца неадчэпнай думкай: яму варта паспрабаваць свае сілы ў прозе… Бо халодная іранічнасьць, здольнасьць да *канструяваньня*, мажліва, тут маглі б мець куды большы эфэкт!

Жыцьцё не спыняецца — і Беларускі ПЭН-Цэнтар арганізаваў майстар-клясы для ляўрэатаў новага конкурсу, гэтым разам прысьвечанага 700-годзьдзю Пэтраркі. Сярод іх мы, дарэчы, зноўку ўбачылі Глеба Лабадзенку, Кацярыну Марголь, Юлію Шастак і яшчэ 14 паэтаў і празаікаў. Дасьць бог, гэтай сустрэчай будзе запачаткавана й новая кніжка.

**Лявон Баршчэўскі**

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Анішчанка Я. Камісары Касьцюшкі:** Дакумэнты паўстаньня 1794 г. у Літоўскай правінцыі: У 6 т. Т. 1. — Менск: В.Хурсік, 2004. — 364 с. 150 ас.

Рапарты, допыты, справаздачы часоў Касьцюшкавага паўстаньня — унікальныя гістарычныя крыніцы, расшуканыя аўтарам у архіве Польскай акадэміі навук у Курніку й перакладзеныя на беларускую мову. Матэрыялы кнігі ўпершыню шырока знаёмяць зь дзейнасьцю парадкавых камісій паўстаньня, роля якіх да сёньня застаецца маладасьледаванай. Наступныя тамы зборніку адлюструюць дакумэнты, зьвязаныя з падзеламі Рэчы Паспалітай ды інкарпарацыяй Беларусі ў склад Расейскай імпэрыі. У «Акадэмкнізе» цана блізу 15000 руб.

**Аўласевіч М., Якубовіч Т. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы: А—К.** — Магілёў: МДУ імя А.Куляшова, 2003. — 242 с. 1000 ас.

У «Акадэмкнізе» цана 6510 руб.

**Край легендаў:** Гісторыя Беларусі паводле паданьняў і легендаў / Падрыхт. К.Цьвірка — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 400 с. 1000 ас.

Легендарныя героі беларускай мінуўшчыны й гістарычныя асобы — Рагвалод, Тур, Усяслаў Чарадзей, Гедымін, Вітаўт — паўстаюць у кнізе ў тым вобразе, у якім захавала іх народная памяць. Зьмешчаныя ў выданьні легенды й паданьні даюць уяўленьне пра стаўленьне беларусаў да значных гістарычных падзеяў — Крэўскай уніі, Грунвальдзкай бітвы, войнаў з Масковіяй. У «Акадэмкнізе» цана 5800 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Першая і апошняя імпэрыя

## Да трыццатай гадавіны «рэвалюцыі гвазьдзікоў» у Партугаліі

*Дэмакратыя і імпэрыя несумяшчальныя.*
Салязар

**Сярэдні беларус ведае пра Партугалію пераважна са спартовых навін. Між тым, лёсы Беларусі й Партугаліі маюць пэўнае падабенства. Абедзьвюм гэтым краінам, амаль роўным паводле насельніцтва і тэрыторыі, давялося доўгі час існаваць у цені «старэйшага брата» (Расеі і Гішпаніі адпаведна), доўга знаходзіцца па-за эўрапейскай супольнасьцю праз аўтарытарныя рэжымы (спадзяёмся, «наш» праіснуе менш за партугальскі). Дый наагул, гістарычныя шляхі Партугаліі й Беларусі дужа цікавыя самі сабой.**

Своеасаблівасьць гістарычнага лёсу Партугаліі, мабыць, найлепш адлюстроўвае прымаўка «Партугалія з Эўропы — апошняя, а з Атлянтыкі — першая». Заціснутым з кантынэнту вялікім суседам, партугальцам заставаўся адзін шлях — праз мора.

Менавіта партугальскімі падарожнікамі была распачатая эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыцьцяў. Тры самыя славутыя маракі сьвету — Калюмб, Магелян і Васка да Гама. Два апошнія — партугальцы. Дый Калюмб напачатку прапаноўваў паслугі каралю Партугаліі і карыстаўся партугальскімі мапамі. Партугальскія паходы адкрывалі для Эўропы загадкавы Ўсход, таямнічую Афрыку, зусім невядомую раней Бразылію.

> У Партугаліі была абвешчана афіцыйная жалоба з нагоды сьмерці Гітлера і адначасова не дапускалася асабістая крытыка Сталіна.

Па сёньня мы карыстаемся партугальскімі словамі для абазначэньня ўсходніх зьяваў: «касты», «пагада», «бонза». Каралі Партугаліі ўключалі ў свае тытулы Гвінэю, Эфіёпію, Арабію, Пэрсію, Індыю. І гэта быў далёка ня поўны пералік земляў, якіх дасягнулі партугальцы.

Але гэты фантастычны ўзьлёт маленькай краіны быў трагічна і гвалтоўна спынены. У 1578 г. малады партугальскі кароль Сэбасьцьян не вярнуўся з ваеннай экспэдыцыі ў Марока. Спадкаемцаў ён не пакінуў, і праз два гады каралеўства было анэксавана Мадрыдам. Партугальцы не зьмірыліся са стратай незалежнасьці. 1 сьнежня 1640 г. паўстаньне ў Лісабоне за адзін дзень паклала канец кастыльскаму панаваньню. Наўрад ці знойдзецца ў гісторыі прыклад больш хуткага — за 24 гадзіны — аднаўленьня незалежнасьці.

Аднак за час гішпанскага панаваньня Партугалія з сусьветнай імпэрыі зрабілася другараднай, адсталай эўрапейскай дзяржавай. Такая мэтамарфоза спарадзіла ў партугальцаў своеасаблівы сьветапогляд — сэбасьцьянізм, у аснове якога было ўяўленьне, што зьніклы кароль дон Сэбасьцьян вернецца і зноў зробіць Партугалію сусьветнай імпэрыяй. Сэбасьцьянізм уключаў культ мінуўшчыны, імпэрскую і мэсіянскую ідэю. Усё гэта знайшло ўвасабленьне ў рэжыме і асобе Салязара.

Антоніу Алявэйра ды Салязар нарадзіўся ў 1889 г. на поўначы краіны. Гэты вясковы хлопец меў неабыякія здольнасьці — з посьпехам скончыў Каімбру, адзін з самых старажытных унівэрсытэтаў Эўропы, — і немалыя амбіцыі. Яго марай было, як ён сам казаў, стаць першым міністрам абсалютнага манарха. Інакш кажучы, мець рэальную ўладу, застаючыся ў цені. І такая магчымасьць неўзабаве надарылася.

Генэралы, якія ўзялі ўладу ў выніку перавароту 1926 г., запрасілі яго навесьці парадак у фінансах. Гэтае даручэньне Салязар выканаў на «выдатна». Дэфіцыт бюджэту быў ліквідаваны без замежных пазык, у краіне разгарнулася будаўніцтва. Салязара пачалі называць выратавальнікам краіны і нават «найвыдатнейшым міністрам фінансаў усіх часоў». Яму ж гэтага было мала. Неўзабаве Салязар робіцца прэм'ер-міністрам. Пасьля чаго прымаецца канстытуцыя, якая абвяшчае Партугалію «Новай Дзяржавай». Што ж уяўляла сабой гэтая «Новая Дзяржава»? На думку яе стваральнікаў, яна павінна была выправіць памылкі дэмакратычных і таталітарных рэжымаў, якім аднолькава была ўласьцівая партыйнасьць. Таму адмаўляліся і шматпартыйнасьць, і прынцып партыі-дзяржавы. На думку Салязара, яны аднолькава садзейнічаюць уплыву масаў на палітыку, у той час як апошняя павінна быць манаполіяй эліты, стварыць якую «важней, чым навучыць усіх чытаць». Думка, як сьведчыць беларускі досьвед, вельмі слушная.


WWW.CITY.LONDONMET.AC.UK

**Салязар адмаўляў і шматпартыйнасьць, і прынцып партыі-дзяржавы. На яго думку, яны аднолькава садзейнічаюць уплыву масаў на палітыку, у той час як апошняя павінна быць манаполіяй эліты, стварыць якую «важней, чым навучыць усіх чытаць».**

Элітарным дэклярацыям адпавядаў і фасад «Новай Дзяржавы». Доктар Салязар быў з выгляду зусім не падобны да клясычнага дыктатара. Ён заўсёды насіў цывільны строй, амаль не выступаў з прамовамі і ўвогуле не любіў зьяўляцца перад грамадой. У Партугаліі не было пакараньня сьмерцю, выходзілі апазыцыйныя выданьні (што пры непісьменнасьці большасьці мясцовага люду і моцнай цэнзуры не ўяўляла пагрозы). І тым ня менш, гэта была сапраўдная дыктатура. Нават набліжаныя да Салязара людзі адчувалі ў яго прысутнасьці жах. Тыя ж, хто выступаў супраць, папросту зьнікалі ў сутарэньнях тайнай паліцыі — ПІДЭ, у трапічных канцлягерах, дзе зьняволеных хутка зводзіла на той сьвет трасца.

У той жа час Салязар сымпатызаваў сваім «калегам». У краіне была абвешчана афіцыйная жалоба з нагоды сьмерці Гітлера і, нягледзячы на афіцыйны антыкамунізм, не дапускалася асабістая крытыка Сталіна.

У салязараўскія часы Партугалія была беднай, адсталай краінай, якая займала апошняе месца ў Заходняй Эўропе па ўсіх сацыяльна-эканамічных паказчыках, але заставалася імпэрыяй, якая мела ўладаньні ў Азіі (Гоа, Макао, Усходні Тымор) і Афрыцы (Ангола, Мазамбік, Партугальская Гвінэя, Астравы Зялёнага Мысу і Сан-Тамэ). Салязар бачыў у захаваньні імпэрыі гарантыю далейшага існаваньня свайго рэжыму і паўтараў, што Партугалія будзе мець калёніі яшчэ на працягу стагодзьдзяў. Гэтую думку ўсяляк імкнуліся прышчапіць тубыльцам, убіваючы ім у галовы, што яны жывуць у Партугаліі — вялізнай краіне, якая займае некалькі кантынэнтаў. І трэба сказаць, такая «адукацыя» давала вынікі. Так, у каляніяльныя часы 85% мазамбікцаў ня ведалі, дзе знаходзіцца Мазамбік, а некаторыя ўвогуле лічылі, што ён у Партугаліі.

Між тым, часы каляніялізму скончаліся. Большасьць мэтраполій прызнала правы сваіх былых чорных падданых на незалежнасьць. І толькі ў Партугаліі не хацелі чуць аб дэкалянізацыі. Такая пазыцыя вяла да бясконцых войнаў, міжнароднай ізаляцыі. У краіне ўзмацніўся апазыцыйны рух, асабліва сярод моладзі і інтэлігенцыі. Улады адказвалі закрыцьцём школ, ліцэяў. У 1963 г. быў забаронены партугальскі Саюз пісьменьнікаў. Аднак апазыцыя ўсё мацней нагадвала аб сабе, рэгулярна выстаўляючы на выбары кандытаў, якія з кожным разам набіралі ўсё больш галасоў.

З 1968 г. фізычны і разумовы маразм дыктатара зрабіўся відавочным. Новым прэм'ерам стаў 64-гадовы прафэсар права Марсэлу Каэтану. Каэтану не належаў да найбліжэйшага атачэньня Салязара і лічыўся чалавекам больш талерантным. Пры ім адбылося зьмякчэньне рэпрэсіўнага рэжыму: вызвалілі вязьняў, пачалі перамовы з апазыцыяй. Аднак Каэтану ня мог ці не хацеў знайсьці палітычнага рашэньня каляніяльнага пытаньня. Між тым, вайна прыносіла адны паразы.

У 1961 г. Партугалія згубіла Гоа, якое адышло Індыі. У 1973-м Партугальская Гвінэя стала незалежнай рэспублікай Гвінэяй-Бісаў. Партызанская вайна ахапіла Анголу, Мазамбік, Усходні Тымор. Каэтану ж не хацеў слухаць вайскоўцаў, якія прапаноўвалі пачаць перагаворы з партызанамі.

> Пакараньня сьмерцю не было, выходзілі апазыцыйныя выданьні, што пры непісьменнасьці большасьці люду не ўяўляла пагрозы. Затое апанэнты рэжыму зьнікалі ў сутарэньнях тайнай паліцыі

Урэшце армія, стомленая вайной, узяла ўладу ў свае рукі. 25 красавіка 1974 г. урад Каэтану быў арыштаваны. Яшчэ праз год Партугалія прызнала незалежнасьць сваіх калёній. Так скончыла сваю гісторыю першая і апошняя каляніяльная імпэрыя Эўропы. Яе лёс яшчэ раз пацьвярджае ісьціну, якую некаторыя ня хочуць засвоіць: імпэрская палітыка несумяшчальная з дэмакратыяй і нясе ў сабе пагрозу палітычнага самазабойства.

**Усяслаў Шатэрнік**


WWW.IUJC.PT

**25 красавіка 1974 г. Вайскоўцы з гвазьдзікамі ў рулях перамаглі дыктатуру.**

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

# Пячорны дэтэктыў

«Мільён год да нашай эры» (RRRrrr!!!)

Францыя, 2004, каляровы, 98 хв.

**Жанр:** Камэдыя з элемэнтамі абсурду

**Адзнака:** 4 (з 10)

Актор і рэжысэр Ален Шаба, які паставіў нядаўна «Астэрыкса й Абэлікса: місія Клеапатры», адпраўляе сваіх герояў шчэ далей у мінулае, дзе яны канчаткова дзяцінеюць і пачынаюць гучна рыкаць.

У дапатопныя часы, калі па Зямлі гулялі маманты, курамаманты, сьвінамамаманты і нат чэрвемаманты — усе зь біўнямі, — разгортваецца шпіёнская гісторыя з выкраданьнем сакрэту шампуню племем брудновалосых у племені чыставалосых. Акрамя таго, шаман чыставалосых ператвараецца ў сэрыйнага кілера, які помсьціць аднапляменьнікам за сьмерць свайго сабачкі — і сьледзтва па справе маньяка вядуць два лайдакі-абібокі.

Такія асучасьненыя жарсьці не перашкаджаюць карціне заставацца нявіннай сямейнай камэдыяй і прафэсійным кінакапусьнікам. Насуперак рэкляме, Жэрар Дэпард'ё выконвае ў фільме ролю другога пляну (дарэчы, жонка ягоная — шымпанзэ).

Акторы і рэжысэр з асалодаю б'юць бібікі — і пачатак карціны глядзіцца забаўна. Далей выдумкі бракуе, але ў любым выпадку наіўны французскі абсурдызм, хаця часам і ня першае сьвежасьці, зусім не безнадзейны для гледача, які вырашыць адпачыць.

**Андрэй Расінскі**



WWW.MARSDISTRIBUTION.COM

# «Крама» ў ТЮГу



**7 траўня** (пт) ў Тэатры юнага гледача адбудзецца вялікі акустычны канцэрт гурту «Крама». Упершыню будуць выкананы вядомыя і новыя творы ў мяккім камэрным гучаньні. Пачатак у 19.00. Тэл. для даведак 671-58-65.

## Лустачка ківі між родных яблыкаў

У галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» — выстава слыннага дзіцяці нэпальскага неба Алана Рано (якога журналісты «Ва-банку» зь невядомых прычынаў абазвалі Ананам). Вабяць ды будзяць згадкі пра ледзяшовыя горы ды марцыпаны напісаныя алейнымі фарбамі горы, якіх ты ніколі ня бачыла ды не малявала. Дзіцячае чытаньне зь ліхтарыкам Янкі Маўра ды экстрэмальнае карасканьне на яблыню (прыкмета: дзеўка на яблыні — яблыкаў ня будзе). Шалёныя кветкі тваіх мрояў. Месцамі моцна нагадвае ўлюбёнага Драздовіча (асабліва «Руйнаваньне цемры»). Няма людзей. Ня трэба барбараў ды мэсіянэраў у паганскім храме. Надпісаў не чытаеш. Па-расейску ды па-ангельску. Твае камэнтары ў кнігах водгукаў у стылі «Яе разам з матчынай цыцкаю даў табе ў твае вусны бог» (Караткевіч пра мову). Дзядзька з лэйбаю просіць ня моцна лаяць: пазбавяць прэміі. А ківі, аказваецца, у Нэпале не растуць. Толькі бананы.

**Болачка**

## Фэст беларускай юшкі

**8 і 9 траўня** ў Раўбічах адбудзецца «Фэстываль беларускай юшкі». Каб трапіць на фэстываль, трэба зарэгістравацца ў Беларускай фэдэрацыі рыбалоўнага спорту.

## Крамэр і Кузьняцоў

**6 траўня** (чц) ў ПК прафсаюзаў канцэрт Данііла Крамэра (фартэпіяна), Аляксея Кузьняцова (гітара) і шоў «Джаз-рынг». Пачатак а 19-й. Цана квіткоў ад 10000 да 25000 руб.

## Выставы

### CPVT і Вясельны салён

**Да 7 траўня** ў выставачным павільёне НВЦ «Белэкспа» адбудзецца выстава «CPVT» (кінавідэатэхніка), а з **14 да 16 траўня** там жа можна наведаць 3-ю беларускую спэцыялізаваную выставу «Вясельны салён-2004».

### Марк Шагал

**Да 23 траўня** ў Гістарычным музэі экспануецца выстава «Марк Шагал і мастакі эўрапейскага авангарду». Можна паглядзець каляровыя і чорна-белыя літаграфіі ды ксылаграфіі твораў В.Кандзінскага, П.Пікаса, М.Мацiса, Ф.Лежэ ды іншых.

### Расейскі жывапіс

**Да 10 траўня** ў Мастацкім музэі экспануецца выстава «Расейскі жывапіс пачатку XX ст.». Творы з фондаў Мастацкага музэю.

### Народжаныя для мора

**6 траўня** ў Літаратурным музэі а 19-й гадзіне адкрыецца выстава «Народжаныя для мора». На экспазыцыі будуць выстаўленыя працы суднамадэлістаў і літаратурныя творы аб марскіх прыгодах і падарожжах.

### Забораў у Мармуровым палацы

У Мармуровым палацы Санкт-Пецярбурга (вул.Вялікая Мільённая, 5/1) з **29 красавіка да 29 траўня** адбываецца выстава твораў Барыса Заборава: жывапіс, станковая графіка, каляж і скульптура. Менскі мастак, які ў 1981 г. выехаў у Парыж, на сёньня лічыцца адным з самых дарагіх і вядомых беларускіх жывапісцаў.

## Канцэртныя залі й тэатры

### Камэрная заля

**7** (пт) — канцэрт скрыпічнай музыкі.

**11** (аўт) — канцэрт Яўгена Лятэ (труба).

### Опэра

**6** (чц) — сьвяточны канцэрт «Вясна, каханьне, перамога...».

**11** (аўт) — «Князь Ігар».

**13** (чц) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

### Тэатар імя Янкі Купалы

**6** (чц) — «Каварства і каханьне».

**7** (пт) — «Страчаны рай».

**8** (сб), **14** (пт) — «Каханьне ў стылі барока».

**10** (пн) — «Я не пакіну цябе...».

**12** (ср) — «КІМ».

**13** (чц) — «С.В.».

**15** (сб) — «Парфён і Аляксандра».

**Малая сцэна**

**7** (пт), **8** (сб) — прэм'ера спэктаклю «Баляда пра каханьне» паводле аповесьці Васіля Быкава «Альпійская баляда».

**10** (пн), **15** (сб) — «Салямэя».

### Балет

**7** (пт) — «Сьпячая красуня».

**12** (ср) — «Страсьці (Рагнеда)».

**14** (пт) — «Шчаўкунок».

### Драматычны тэатар імя М.Горкага

**Вялікая заля**

**6** (чц) — «На Залатым возеры».

**8** (сб) — «У прыцемку».

**12** (ср) — рок-опэра «Анджэла і іншыя».

**13** (чц) — «Перад захадам сонца».

**14** (пт) — «Зьвеставаньне Марыі».

**15** (сб) — «Дэтэктар хлусьні».

**Малая заля**

**6** (чц) — «Пэрпэтум мобіле, альбо Вечар габрэйскай показкі».

### Тэатар «Беларускія сэзоны»

вул.Фрунзэ, 5

**8** (сб) — «Карусэль».

**11** (аўт) — «Сублімацыя каханьня».

### Тэатар «Дзе-я?»

**12** (ср), **13** (чц) — «Ня бойся быць шчасьлівым».

**14** (пт) — «Гарбата зь вярблюдам».

### Клюб імя Дзяржынскага

**8** (сб) — «Валянцінаў дзень».

### Рэспубліканскі тэатар беларускай драматургіі

**6** (чц), **7** (пт) — «П'емонцкі зьвер».

**11** (аўт), **12** (ср), **15** (сб) — «Адэль».

**14** (пт) — «Толькі дурні сумуюць».

### Музычны тэатар

**6** (чц) — «Марыца».

**7** (пт) — канцэртная праграма «Песьні Перамогі».

**8** (сб) — «Севастопальскі вальс».

**11** (аўт), **12** (ср) — рок-опэра «Юнона і Авось».

**13** (чц) — «Каралева чардашу».

**14** (пт) — музычнае шоў «Галактыка каханьня».

**15** (сб) — «Вясёлая ўдава».

## Дзіцячыя спэктаклі

### Тэатар імя Янкі Купалы

**15** (сб), **16** (ндз) — «Афрыка».

### Балет

**16** (ндз) — «Чыпаліна».

### Тэатар юнага гледача

**6** (чц) — «Тая, што зьдзейсьніла цуд».

**7** (пт) — «Паліяна».

**11** (аўт), **12** (ср) — «Тарас на Парнасе».

**13** (чц) — «Рыцар Ордэну Сонца».

**14** (пт), **15** (сб) — «Каліф-башмачнік».

**16** (ндз) — «Маленькі лёрд Фаўнтлерой».

### Экспэрымэнтальная сцэна

**8** (сб) — «Залатое сэрцайка».

**14** (пт) — «Апошняя дуэль».

**16** (ндз) — «Гісторыя каханьня Паласатага ката і спадарыні Ластаўкі».

### Рэспубліканскі тэатар беларускай драматургіі

**15** (сб) — баль-маскарад «Крыштальны пантофлік».

### Музычны тэатар

**16** (ндз) — «Айбаліт-2002».

## У менскіх кінатэатрах з 7 да 9 траўня

**«Аўрора»** (253-33-60)

«А вось і Полі» (прэм'ера): **7** (пт) 17.00, 19.00, 20.50; **8, 9** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 20.50.

«Заплямленая рэпутацыя»***: **7** (пт) 16.30, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 16.30 (іл), 21.00.

«Старыя»: **7—9** (пт—ндз) 19.10.

«Жэня, Жэнечка і Кацюша»: **7—9** (пт—ндз) 14.30.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«50 першых пацалункаў»: **7** (пт) 18.50; **8, 9** (сб, ндз) 14.00 (іл), 18.50.

«Летуценьнікі»****: **7—9** (пт—ндз) 21.00.

«У сузор'і Быка»: **7—9** (пт—ндз) 16.40.

«Дзяўчынка шукае бацьку»: **7—9** (пт—ндз) 12.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Неслужбовае заданьне» (прэм'ера): **7** (пт) 14.20; **8, 9** (сб, ндз) 14.50 (іл), 16.40.

«Пакуты Хрыстовы»: **7** (пт) 16.10, 18.30, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 18.30, 21.00

**«Масква»** (223-27-10)

«А вось і Полі» (прэм'ера): **7** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **8** (сб) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **9** (ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Монстар»**** («Оскар-2004»): **7** (пт) 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 19.00, 21.00.

«Нешчасьліўцы»: **7** (пт) 17.00, 19.00; **8, 9** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Мільён год да нашай эры» (прэм'ера): **7** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

«Зязюля»: **7, 8** (сб, ндз) 13.00 (іл).

**«Піянер»** (227-64-87)

«Скарбы Амазонкі»: **7—9** (пт—ндз) 15.20, 17.10, 21.10.

«Буйная рыба» («Оскар-2004»): **7—9** (пт—ндз) 19.00.

«Зорка»: **7** (пт) 13.40; **8, 9** (сб, ндз) 13.45.

**«Цэнтральны»** (227-34-16)

«50 першых пацалункаў»: **7** (пт) 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 12.00 (іл), 14.30, 16.30, 18.30, 20.30.

«Егер»: **7** (пт) 11.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:

*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;

**** — дарослым з 18 год.

## Юнаму гледачу

**«Аўрора»**

Зборнік мультфільмаў: **8, 9** (сб, ндз) 13.00.

**«Піянер»**

«Тайна Заборскага віру»: **7—9** (пт—ндз) 12.00.

«Пітэр Пэн у Нідзеляндыі»: **8, 9** (сб, ндз) 10.20.

## Клюбы

### Graffiti Club

**6** (чц) адбудзецца сустрэча з бардамі Галінай і Барысам Вайханскімі. Пачатак а 20-й.

**13** (чц) бардаўскі канцэрт Мікалая Анісімава. Пачатак а 20-й. Даведкі праз т. 758-40-54.

### Bronx

вул.Варвашэні, 17/1, т.288–10–61, velcom: 103 і 105.

**7** (пт), 22.00. Мадэра Хард Блюз. Жывы гук.

**12** (ср), 22.00. Alegrias. Жывы гук.

**13** (чц), 22.00. Клюбны чацьвер, dj Dust.

### NC

вул.Кастрычніцкая, 17, www.newclub.info.

**7** (пт), 19.00. Вечар карыбскай танцавальнай музыкі «Sweet Home Jamaica». Граюць Froglegs (Пецярбург), ex Вірус ліха (Менск), Хайле Тумс (Менск). Квіткі 6500.

### Presto

пр.Скарыны, 56, тэл.232–54–49.

**8** (сб), 23.00. Вечарына «The winer takes it all» (вэтэранам клюбнага жыцьця прысьвячаецца). Граюць dj Ярык (Кіеў-Масква-Менск), dj Бэргама (house-o-holics). Квіткі: загадзя 12000, на месцы 14000. Даведкі: 777-14-24.

### REMIX'82

вул.Чкалава, 12.

**7** (пт), 22.00. Hell'n'Heaven, 10-гадзінны карнавал у 2-х арыях: Рай і Пекла. Рай: DJ Палёны & DJ Міця. Толькі белае. Анёлы і багі. Сакрэтныя анёльскія ды-джэі і музыкі. Пекла: DJ Vital (Рыга). Толькі чорнае. Чорты і д'яблы. Сакрэтныя д'ябальскія ды-джэі і музыкі. У межах імпрэзы — прэзэнтацыя кампакту DJ Dubrovskaya «Hell'n'Heaven» (limited edition collection version). Фэйскантроль, дрэскод. Квіткі: папярэдне 15.000 (CD ў падарунак, розыгрыш прызоў ад крамы «Traffic»); на месцы ў карнавальных касьцюмах 15000 (CD ў падарунак), без касьцюмаў 20000. Даведкі: 694-18-27, 750-69-67, info@diskoteq.com

### X-Ray

вул.Інтэрнацыянальная, 27, тэл.223–93–55.

**7** (пт), 22.00—3.00. Dj Бэргама.

**8** (сб), 22.00—3.00. Dj Grizzly.

### Гудвін

пр.Скарыны, 19, тэл. 226–13–06, 626–13–03.

**7** (пт), 21.00. N.C. (джаз-трыё). Жывы гук.

**8** (сб), 21.00. Мадэра Хард Блюз. Жывы гук.

### Ямайка

вул.Альшэўскага, 10, т. 252–07–26.

**7** (пт), 21.00—7.00. Pre/after party. 21.00—24.00 dj Даша Пушкіна. 3.00 — XXX dj Noche, dj Zmeev.

**8** (сб), 3:00 — XXX. After party. Arsenti Tchouprina, dj Антонаў (Менск).

Тацяна Сьнітко

# Тры колеры:

**Мне ня хочацца зараз пачынаць гаворку са сьмерці. Мне хочацца пачаць яе з жыцьця. Магчыма, зь яго найлепшай пары. Калі згадваю падзеі таго часу, здаецца, яны зацягнуты смугой. Сіняй-сіняй... Уяўляю, як па-ідыёцку рамантычна гэта гучыць: я даўно выйшла з рамантычнага ўзросту.**

*Неяк увесну 90-га над маім вухам пачуўся лёгкі выбух:*

*— Во! Глядзі! То ж нашы!!!*

*Голас быццам знаёмы. Мы з маім спадарожнікам машынальна паварочваем галовы.*

*Перад намі стаіць уласнай пэрсонай Вася Шугалей. Побач — ягоная сяброўка Юля. Пасярэдзіне — вузкая, брукаваная вуліца. Гэта вуліца Вільні.*

*Шугалей стаіць, усьміхаецца, прывітальна махае рукою. І мы таксама пачынаем махаць. Сюды, сюды! Мы якраз зьбіраемся вось у гэтую кавярню...*

*Цікава, што з Васілём і Юляй мы бачыліся дагэтуль усяго аднойчы — і, як мне падаецца, тады нават не размаўлялі. Мы размаўлялі з «Паганіні», хлопцам з Васевага гурту. Гэта было ў студзені 90-га году за кулісамі сцэны менскага Палацу чыгуначнікаў. Калі мне ня здраджвае мая памяць (а калі здраджвае, няхай мяне паправіць нехта менш беспамятны), менавіта там праходзіў адзін з тураў рок-фэсту «Тры колеры».*

*Не запомніць Шугалея пасьля гэтага фэсту было б вельмі дзіўна, абсалютна немагчыма. І прыемна зьдзівіла, што ён запомніў нас.*

*— Вы тыя самыя журналюгі, што не паехалі на вакацыі, а цягаліся па рок-фэстах! — канстатаваў ён.*

*— Не-а! Што ты! Гэта зусім ня мы!.. Хочаце кавы?*

*менавіта ў гэты дзень. Так было й тады. Мы хацелі проста выпіць кавы, а на самай справе пайшлі адзначаць суседзкае сьвята. Нагадаў пра Казюкас Шугалей.*

*Удваіх з маім хлопцам мы бадзяліся па Вільні ціха, сьціпла й неяк дужа інтэлігентна. Учацьвярых з Васілём і Юляй мы ўваліліся ў найбліжэйшую кавярню неяк гучна ды весела. Цяпер мне здаецца — амаль як Васілёў гурт з эпатажнай назвай выходзіў на сцэну. Праўда, тут на нас мала хто зьвяртаў увагу. Ну й дзякуй богу!*

*Мы не пілі гарэлкі ў гонар Казюкаса. Тады мы ня мелі амаль ніякіх благіх звычак. Да таго ж, не асабліва мелі грошы на благія звычкі. І што самае каштоўнае: грошы тыя нам былі непатрэбныя ў прынцыпе. Я маю на ўвазе грошы, а не капейкі, якія мы гэтак называлі ў тую шчасьлівую пару.*

*Мы пілі віленскую каву, елі віленскія чабурэкі, потым палілі віленскія цыгарэты... Мы дыхалі віленскім паветрам і былі шчасьлівыя гэтым. Памятаю, як распавядала Шугалею, што ўжо год прывожу ў родны інтэрнат газэты «Саюдысу»: потым інтэрнат чытае й дзівіцца, як гэта літоўцы наважыліся хацець незалежнасьці ад Саюзу. «Во чым ты забіваеш сабе галаву!» — з павагай сказаў Шугалей. І мы пайшлі здабываць тыя газэты ўсе разам.*

...Васеў гурт сапраўды стаў адкрыцьцём тады, на пачатку 90-га. Здаецца, паводле глядацкіх сымпатый, ён нашмат апярэдзіў нікому не вядомы «Ляпис Трубецкой». «Міхалкі» (сяброўская «мянуха» сяброў гурту ў музычна-мастацкім асяродзьдзі моладзі) тады сьпявалі нейкую песеньку пра буфэтчыцу Асю. Яна павесілася трохі, і на тым усё скончылася. Да пары. Бо ўжо на фэсьце сёйтой прадказваў «Ляпісам» вялікую будучыню.

«Ляпісы» выступалі недзе ўсярэдзіне аднаго з канцэртаў. Фэст цягнуўся некалькі дзён. І вось адзін з гэтых дзён скончыўся для часткі гледачоў неспадзявана — выхадам на сцэну Васі.

Ён уварваўся туды ў шэрым пінжаку, які ледзь сыходзіўся на жываце, бо быў удвая меншы памерамі, і гучна павітаўся з заляй. Рыпнула скрыпка, прабубнелі бубны — Вася пачаў танчыць. Заля грымнула сьмехам. Ён танчыў з камічным тварам, так натуральна ў сваёй нязграбнасьці махаючы рукамі. І пры гэтым твар невядомага саліста невядомага яшчэ гурту быў такім сур'ёзным, а блакітныя вочы на ім — такімі вялікімі і шчырымі... Гэта адразу ўспрымалася як пародыя на некаторых людзей, што ставіліся да сябе звышсур'ёзна і ніколі не зьмянялі выразу твару на чалавечы. На маіх вачах пара чалавек ад рогату зваліліся пад крэслы.

Здаецца, потым Глёбус ахрысьціць Шугалея «клоўнам беларускай рок-сцэны». І будзе мець рацыю. Выступ Шугалея з «Ы-Ы-Ы» напраўду выглядаў як цэльная клаўнада, як міні-спэктакль тэатру абсурду з цыркавымі элемэнтамі.

На жаль, мая памяць не захавала ніводнай зь песенек гурту, акрамя аднае, тэкст якой пачынаўся прапановай да дзяўчыны «не душыць прышчы на дупе», каб не занесьці інфэкцыі. Але прастадушна-хуліганскія песенькі ішлі ўперамежку зь вершыкамі. І вось тут — папросту песьня. Тут мая памяць падказвае ўжо занадта шмат! І я мушу наступіць на горла гэтай песьні. Ну не змагу тыя вершыкі я вам дакладна ў газэце працытаваць!

Сяргей Будкін напісаў у «НН», што шугалееўскі панк-гурт «Ы-Ы-Ы» стаўся адкрыцьцём рок-фэстывалю «Тры колеры» — поруч з «Мрояй» і «Бондай». Вядома, гэта не зусім так. Мякка кажучы. Бо гэта проста ня так, ня так абсалютна!

На той момант легендарная «Мроя» даўно не была ніякім «адкрыцьцём». Мы цяпер гаворым пра пэрыяд «Аўстралійскай полькі», а не брутальнага стод-року й Лявонавай фрызуры з коскай на лобе. Пытаньне, ці быў на той час гурт зоркай, падаецца рытарычным. Усе, хто хацеў, даўно «Мрою» для сябе адкрылі.

Што ж да «Бонды» («старой добрай «Бонды», як яе часьцей называлі тады аглядальнікі)... Рэч у тым, што «Бонды» на час правядзеньня «Трох колераў» ужо папросту не існавала ў прыродзе. Гурт распаўся недзе за год да гэтай падзеі. Першы менскі канцэрт «Улісу» — аднаго з гуртоў, што ўтварыўся на аснове бондаўскіх кадраў, — адбыўся ў сакавіку 1989-га. Гэта за 10 месяцаў да фэсту «Тры колеры». Новы гурт выступаў у ДК... халера яго згадае назву. На Фабрыцыюса.

Так што поруч з «Бондай» ды «Мрояй» шугалееўскі панкавы калектыў стаяць ня мог — «яшчэ ці ўжо».

Але адкрыцьцём «Трох колераў» — стаў! Ды яшчэ якім...

*...Я ніколі ня ведала даты літоўскага сьвята Казюкас. І штогод трапляла ў Вільню*


WWW.2000LIGHTERS.COM

**Ва ўсіх сапраўдных клоўнаў вочы — сумныя...**

*...З шапачных знаёмых наша чацьвёрка паступова ператваралася ў сяброў-пачаткоўцаў. Спачатку, натуральна, тусовачных. Пачатак і быў тады пакладзены ў Вільні. Я везла свайго хлопца ў Вільню, каб паказаць яму места, дзе сама перад тым бывала неаднойчы. Але пасьля выпадковай сустрэчы з Шугалеем і Юляю «гідамі» сталі яны.*

*Мы бадзяліся па плошчах, маленькіх крамах і базарчыках, спрабавалі гутарыць зь міліцыянтамі, бабулькамі, прадавачкамі. Па-літоўску, па-беларуску. Гэта было вельмі цікава ў час, калі паўсюль панавала расейшчына. Улюбёнай нагодай размоў зь мясцовымі была тэма «Мы тут трохі заблукалі». Хлусьня, вядома. Але колькі ўражаньняў.*

*Памятаю, мы да непрыстойнасьці шмат і вельмі гучна рагаталі ў той Вільні. Проста на кожным кроку. Маглі спыніцца пасярод праезнай часткі, сагнуўшыся напалам. Калі так здарылася, рэгуліроўшчык даў знак затрымацца аўтамабілю, што імчаўся па той жа паласе. Для нас тады было жартачкамі літаральна ўсё. Мы жартавалі, што, калі так пойдзе далей, спатрэбіцца ня віленскі мент, а менскі катафалк. Потым Шугалей прыкольна высьвятляў, чаго гэта Юля ўсьміхалася таму міліцыянту. Гэтак, зь любой нагоды й безь яе, мы рагаталіся да самага вечару, пакуль дызэль сінім-сінім сакавіцкім вечарам не давёз нас да Менску...*

Прыпанкаваная паэтычная творчасьць Васіля не абмяжоўвалася, вядома, знакамітым «Я бубу цябе ў губу...». Было ж яшчэ, прыкладам, «Упал парнишка с небоскреба...». Альбо «Зачем нам нужны проститутки?». Ніякіх матаў у тых міні-паэмах не было. Усё прасьцей (а таму й складаней). Былі словы з шэрагу тых, што ў цытаваньні газэтай «Навінкі» былі апаганілі тонкі густ нашага «міністэрства праўды». Прыкладам, сюжэт пра «парнишку» насамрэч мае ня столькі мэдыйны, колькі мэдычны зьмест:

Упал парнишка с небоскреба...
(злавесная паўза)
Яйцы разбиты были оба

А тых гаротных прастытутак з другога вершу аўтар увогуле прапаноўваў выкарыстаць не адпаведна прызначэньню! «Пасадзіць у ракету», адправіць «на іншую плянэту»... Бедныя путаны! Чым яны мусілі там займацца без адзінага інвалютнага рубля й крамы «Бярозка»? Па-мойму, касьмічнымі дасьледаваньнямі. Нехта потым пытаўся, ці нельга, акрамя іншай «Плянэты», адправіць іх і на іншую «Юбілейку»...

На пачатку 90-х яшчэ ў большай ступені, чым пры канцы 80-х, распаўсюджваліся беларускамоўныя гурты. Гэта падабалася нам, гледачам. І гэта віталася ўсялякага кшталту журы на розных рок-фэстывалях, а іх тады было ажно па некалькі штук на год. Ня тое што цяпер.

Часта побач зь беларускай мовай на фэстах пачынала гучаць і расейская. Многім здавалася, што нават пры цалкам прымальнай музыцы мова пачынае адыгрываць вырашальную ролю. Прынамсі, часам здавалася, што менавіта ад мовы і больш ні ад чога залежаць сымпатыі рознага гатунку «мэтраў». Мы спрачаліся, ці гэта сапраўды так і ці гэта слушна. Цікава, што самі музыкі, незалежна ад абранае імі мовы творчасьці, аднолькава нэгатыўна ўспрымалі заўвагі, што «сьпяваць па-беларуску — модна». Адны тут жа абураліся, пачыналі казаць пра парывы душы і даводзіць пра ўласны патрыятызм. Другія — таксама абураліся, настойвалі на імкненьні «не дагаджаць журы» і



**Тацяна Сьнітко. Журналістка, сталая аўтарка «НН». Жыве ў Юзуфове пад Менскам.**

# чорны

Успаміны
пра Васю Шугалея

«заставацца сабою».

Вася Шугалей вылучаўся й тут. Ён абсалютна нікому нічога не імкнуўся давесьці — ніводнай, як здавалася, сур'ёзнае рэчы. Ён не зьбіраўся нікому дагаджаць — наадварот, яго сцэнічнае мастацтва магло давесьці якога эстэта да цытаваньня Маякоўскага — у месцы пра «пощечину общественному вкусу». Васіль быў сабой на ўсе сто адсоткаў, хоць і прымаў выгляд шызанутага коміка. І гэта было сапраўды клясна, бо больш так не рабіў тады ніхто. Гэта потым пачалі шукаць падабенства да Мамонава…

*...А потым мы зайшлі ў касьцёл. Гэта я засумавала пад нашыя жарты без касьцельных сьпеваў. Ну як гэта — пабыць у Вільні й не паслухаць імшы альбо гукаў аргана? Наш жа Чырвоны касьцёл быў тады яшчэ Домам кіно…*

*На момант гэтай прапановы Шугалей ператварыўся ў сапраўдную душу нашай кампаніі, зьвязанай гэтай аднадзённай паездкай у суседнюю сталіцу. На маё зьдзіўленьне, Васіль вельмі сур'ёзна ўспрыняў паход у храм. Цяпер я не скажу дакладна, што гэта быў за касьцёл, але месца, бадай, і праз шмат гадоў знайшла б. Памятаю, як мы ўсе пачалі шэптам спрачацца, як трэба хрысьціцца пры ўваходзе, а потым вырашылі кінуць спрэчку — хто што хоча, няхай тое й робіць. Якраз ішла імша. На польскай мове. Мы пастаялі, папрысутнічалі. Мне здавалася, што сысьці адсюль сёй-той з нас захоча ня надта хутка. На маё зьдзіўленьне, не захацеў сыходзіць і Васіль. Заслухаўся. Вось такі, значыць, зусім «несур'ёзны» чалавек!.. Лідэр скандальнага панк-гурту з эпатажнай назвай ведаў, як трэба жагнацца, і не сьпяшаўся сыходзіць з касьцёлу…*

*Зрэшты, і на сцэне ДК чыгуначнікаў, у шэрым строі, пінжаку на адным гузіку, уганяючы ў шок літаратараў нелітаратурнымі вершыкамі й танцамі ў стылі «вятрак», Шугалей мог заставацца самім сабой. Ён мог праз усё гэта давесьці табе нешта больш важкае й істотнае, чымся бачанае табой звонку. Праўда, гэта не заўсёды можна было адразу зразумець…*

У тыя часы я была адной з тых дзяўчынак і хлопчыкаў з блякноцікамі, якія мелі звычку задаваць музыкам першым абсалютна дурное, як на мяне сёньняшнюю, пытаньне: «А чаму вы назвалі гурт так і так?». Часам гэта вылазіла бокам. Скажам, Сяржук Краўчанка з «Улісу», зрабіўшы вялікія і шчырыя вочы, расказаў мне страшную гісторыю. Маўляў, ніякі Джойс тут ні пры чым. Пайшлі ў лес, убачылі ліса, і нехта закрычаў: «У-у-у, ліс!». Я старанна занатавала «лекцыю». Тут зь бедн дзяўчынкі зьлітаваўся Слава Корань. Ён выступіў наперад і дадаў, што Джойс усё-такі «пры чым». Што было потым, казаць цяпер ня буду, гэта ня так важна ў дачыненьні да Васі Шугалея. Важна іншае. Вася ніколі падобным чынам не жартаваў. Увогуле, ён не чакаў «шпілек» ні ад малалетніх, ні ад іншых журналюг. Выскачыўшы на сцэну ў дзівакаватым іміджы, ён адразу пасьля прывітаньня залі сам адказваў на пытаньне, што павісала ў паветры: чаму «Ы-Ы-Ы»?

> Ён уварваўся на сцэну ў шэрым пінжаку, які ледзь сыходзіўся на жываце, бо быў удвая меншы памерамі, і гучна павітаўся з заляй. Рыпнула скрыпка, прабубнелі бубны — Вася пачаў танчыць.

— Калі баба кідае мужыка, — пранікнёна казаў Вася, — то ён ня плача, ня кідаецца з даху, а бывае, што й ня п'е гарэлкі… Ён проста набірае паветра ў лёгкія і выціскае зь сябе: «Ы-ы-ы!!!» — Усё гэта казалася на фоне гукаў скрыпкі, зь якой ягоны сябра Паганіні выціскаў таксама нешта падобнае да трохлітарнай назвы.

Праз сэкунду далучаліся бубны, гітары і ўсё астатняе — пачыналіся песьні й танцы… Заля радавалася.

Тады мы яшчэ не чыталі Джойса. І ня ведалі слова «пэрформанс». Тым ня менш, мы ўспрымалі Васевы сцэнічныя правакацыі належным чынам. Абавязковымі пунктамі праграмы станавіліся паламаная гітара, распоратая падушка, а часцей — усё разам. Пад камэнтары самога Шугалея — то «дэманічныя», то зусім «наіўняковыя». «Вядома, вы скажаце нам: «Ні пуху ні пер'я!» А мы вам вось наадварот: і пуху, і пер'я! Паганіні! Дзе пер'е?» Пакідалі мы залю пад лямант бабулькі-прыбіральшчыцы і міліцыянта з вахты ДК. Яны таксама ня ведалі нічога пра пэрформансы…

Нехта адкрыта крывіўся. Але нам было гэта ўсё да фэні. Мы радаваліся жыцьцю і ад душы сьмяяліся, ужо потым пачынаючы шукаць сэнс. Хутка за Шугалеем пачала хадзіць на канцэрты група падтрымкі зь ягоных прыхільнікаў. Студэнты, школьнікі, пэтэвэшнікі... Мне падабалася іхняя непасрэднасьць. Яны былі такія ж, як мы. А нам было па 17 гадоў. Журналістаў альбо кампазытараў, якія падчас «Трох колераў» ацэньвалі выступы маладых гуртоў, мы іранічна клікалі паміж сабой «мэтрамі». Мы лічылі, што «мэтрам» усё прагрэсіўнае на сцэне наўрад ці падабаецца. Гэта было не зусім так, хоць нашы густы часам не супадалі зь іхнімі. Але нам было абсалютна напляваць, што скажа пра любімы гурт Віталік Сямашка, што напіша Глёбус, потым Віця Мартыненка, што залепяць Падбярэскі з Цыбіным… Мы вясяліліся. Вася дапамагаў нам. За антуражам і бутафорыяй не адразу й ня кожны заўважаў сэнс гэтай гульні. А за дзіваком у шэрым строі з адным гузікам хавалася шматгранная — як потым выявілася — і не такая павярхоўная асоба. Гэты чалавек мог быць і іншым. Можа, слушна заўважыў нехта разумны: ва ўсіх сапраўдных клоўнаў вочы — сумныя…

*Мы абмяняліся каардынатамі і час ад часу хадзілі адно да аднаго ў госьці. Пра што мы тады гаварылі? Цяпер цяжка згадаць. Размаўляць зь імі нам было лёгка. Мой хлопец і Вася знайшлі супольны інтарэс: абодва былі мастакамі-аматарамі. Напэўна, мы многа гаварылі пра мастацтва... Хутчэй за ўсё, не абышлося без абмеркаваньня фільму «Мадэрністы», тады культавага, як мінімум, у паловы журфаку — адзін наш сябра глядзеў яго восем разоў.*

*Магчыма, у наступныя разы мы гаварылі пра нашых малых дзяцей… Час ішоў, чацьвёрка ператварылася ў дзьве маладыя сям'і. Час ішоў далей. Абедзьве сям'і распаліся. Я перастала езьдзіць у Вільню. Я шмат гадоў ня бачыла ні Васі, ні Юлі. Даходзілі толькі нейкія зьвесткі-чуткі. Я доўга ня ведала, чаму адзіная мая любімая песьня расейскага гурту «Браво» — «Ветер знает», і зразумела гэта толькі ў сакавіку 2004-га. Аўтарам слоў аказаўся ён — наш стары прыяцель!*

*...Аднойчы прыйшоў адзін з тых дзён, калі цёмна пры сонцы і не знаходзіш сабе месца пры поўным спакоі. Цэлы шэраг такіх самых дзён быў, напрыклад, перад падзеямі на Нямізе.*

*Захацелася патэлефанаваць камусьці зь сяброў. «Мы так рэдка бачымся, а жыцьцё такое кароткае…» — «Што за філязофскія думкі?» — тактоўна запыталася ў адказ Кася Камоцкая. Я дагэтуль ня ведаю, чаму набрала менавіта яе нумар.*

*Увечары даведалася пра сьмерць Васі Шугалея. З газэты. Як пра незнаёмага чалавека. Яго забілі ўласныя суседзі-алькаголікі. Потым яны тыдзень хадзілі па вуліцах, гаворачы па ягоным мабільніку. Гэтак іх і злавіла маскоўская міліцыя.*

*Не шкада, што жыцьцё разлучае людзей: і нават жывучы побач, ты можаш ня бачыць іх гадамі альбо бачыць амаль штодня ды ня мець часу паразмаўляць. Шкада, што жыцьцё забірае — і забівае. Часам. Як прыладай.*

*А жыцьцё ж такое кароткае!*



АРХІЎ ЮЛІІ ШУГАЛЕЙ

**Шугалей быў ня толькі музыкам, але і графікам. Малюнак Хрыстанемаўляці, зроблены Васілём.**



«КРЫНІЦА»

**Канец 80-х. Шугалей на постэры часопісу «Крыніца».**



WWW.2000LIGHTERS.COM

**Пачатак 2000-х. Шугалей практыкуецца ў палітычнай сатыры.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Чарнобыль: ад болю да бізнэсу

**Новая зброя дзяржавы ў барацьбе з вынікамі Чарнобылю: супраць ізатопаў цэльзію і хронцыю будзе змагацца рынкавы laisser-faire. Гэта дазволіць канчаткова ліквідаваць у бюджэце чарнобыльскі артыкул, а ў гатэлі «Эўропа» бідэ можна будзе паставіць ня толькі ў нумарах, але і ў ліфтах.**

Як піша «БГ», надоечы, выступаючы ў «палатцы», В.Цалко, кіраўнік Дзяржчарнобылю, падзяліўся з дэпутатамі геніяльным пражэктам: на працягу 2006—2008 г. замуціць на тэрыторыі чарнобыльскай зоны некалькі свабодных эканамічных зон (СЭЗ). Лёгіка ў Цалка, відавочна, такая: пачуўшы пра нізкія падаткі, у зону прыпрэцца легіён бізнэсмэнаў. Яны дадуць працоўныя месцы тубыльцам, а мясцовым бюджэтам — грошы.

У выніку эрбэшны бюджэт нарэшце скіне зь сябе хамут чарнобыльскіх расходаў і пераключыцца на больш цікавыя праекты — напрыклад будаўніцтва пяцізоркавага гатэлю «Эўропа» зь бідэ ў кожным нумары.

Як прызнаўся сам сп.Цалко, ідэя з СЭЗ належыць не яму, а экспэртам Сусьветнага банку.

Шкада, што фармат артыкулу не дазваляе разгорнута прэзэнтаваць чарнобыльскую канцэпцыю Сусьветнага банку, канкрэтна — яго славуты рапарт №23883-BY. Ен стракаціць вясёлымі пэрламі, якія не саступаюць бацькавым: «Сярэдні памер дзіцячай дапамогі стварае ў насельніцтва зоны гультайскія настроі і пазбаўляе стымулаў да працы. … Асноўнымі прычынамі праблемаў са здароўем жыхароў зоны зьяўляюцца алкаголь і паленьне».

Куды цікавей тое, што дзяржава зьбіраецца практыкаваць новы падыход вырашэньня праблем Чарнобылю — не за кошт прагрэсіўнага пераразьмеркаваньня бюджэтных асыгнаваньняў, а за кошт стварэньня прывабнага інвэстыцыйнага клімату.

Калі так, я б раіў сп.Цалку не спыняцца на ідэі СЭЗаў, а сьмела пераносіць на беларускую глебу ўвесь гістарычны досьвед камэрцыі.

Ёсьць такі бізнэс-плян — заснаваць «Ост-Чарнобыльскую кампанію», накшталт кампаній піратаў-купцоў у сярэднявечнай Эўропе. Кампаніі трэба даць падатковыя льготы і нават капэрскую ліцэнзію — дазволіць рабаваць усіх «чаўнакоў». Памятуючы пра посьпехі «Вэст-Індыйскай кампаніі» падчас каляніззацыі Карыбаў, можна не сумнявацца, што зона хутка ператворыцца ў пяшчотнае вока Бэрмуды.

Або прыгадайце — якім быў раней імідж штату Нэвада? Так-так, радыяцыйна небясьпечная зона, таму што якраз тут знаходзіцца атамны палігон дзядзькі Сэма. Але не пасьпелі ў Лас-Вэгасе адкрыць першае казыно, як сюды набегла арда бізнэсмэнаў. А чым мы дурнейшыя? Галоўнае — болей фантазіі: хвойніцкі карнавал накшталт Мардзі-Грас «Чарнобыльскі шлях», нараўлянскае казыно з гульнявымі аўтаматамі «Трохрукі мутант», лоеўскае шоў «Сьвяцяшчыяся ліквідатары»…

Аднак аптымальны варыянт для напампоўваньня рэгіёну грашыма — не свабодная эканамічная, а свабодная дэмакратычная зона (СДЗ). Ярмошына мусіць хутчэй абвясьціць, што парлямэнцкія выбары ў зоне адбудуцца згодна з усімі міжнароднымі стандартамі — без папярэдняга галасаваньня, з празрыстым назіраньнем, без адмінрэсурсу, з роўным доступам да СМІ…

Ведаючы напалеонаўскія амбіцыі нашых дэмакратаў, гарантую, што ўсе будуць вылучацца ад зоны. У выніку абсалютная большасьць з 40 мільёнаў баксаў, якія Кангрэс зьбіраецца адшпіліць апазіцыі, абавязкова асядуць тут — на карысьць ахвяраў Чарнобылю.

Гэта дазволіць канчаткова ліквідаваць у бюджэце чарнобыльскі артыкул. Грошай будзе шмат. Так шмат, што ў гатэлі «Эўропа» бідэ можна будзе паставіць ня толькі ў нумарах, але і ў ліфтах.

**Лёлік Ушкін,** левы радыкал

IN MEMORIAM

## Алесь Пісьмянкоў



Сустракаю Зьмітра Коласа і выпадкова даведваюся, што сход інтэлігенцыі адбываецца ў Доме літаратара. Заходжу і чую сумную навіну: памёр Алесь Пісьмянкоў. Ён быў з тых рэдактараў, што спакойна друкаваў мае тэксты. Алеся хаваюць на Кальварыі. Увечары я туды еду, але магілы не знаходжу. Мокну пад халодным дажджом, пакуль не цямнее. Сыходжу і складаю верш:

**На разьвітаньне паэту Пісьмянкову**

Бывай, Алесь, адпачывай,
Зрабіў, што змог, і дзякуй Богу.
Мы правялі цябе ў дарогу,
Як што ня так, дык выбачай.

Пісьменьнікам перадавай
Зямны паклон і без трывогі
Шукай бяз нашай дапамогі
Дзе там чысьцец, дзе сьветлы рай.

**Адам Глёбус**

## Янка Баран

**1923 — 2004**

Сёлета, 26 сакавіка, у канадыйскім горадзе Таронта памёр Янка Баран. Другая сусьветная вайна выкінула яго з роднай вёскі Сьвіла, што на ўсход ад Каралеўшчыны ў Докшыцкім раёне.

Янка, сябра Згуртаваньня беларусаў Канады і парафіі Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, што працаваў у «Ford Motor Co» у Дэнквілі каля Таронта, быў вядомы сваёй дабрачыннасьцю ў беларускім грамадзкім, рэлігійным і культурна-асьветным жыцьці. Вечная Яму памяць ад сурodзічаў. Наша спачуваньне Янкавай радні.

**Кастусь Акула**

## Валянціна Пашкевіч



**25 сакавіка 2004 г.** перастала біцца сэрца беларускага пэдагога, няўтомнае грамадзкае дзяячкі Валянціны Пашкевіч. Усё сваё жыцьцё прысьвяціла яна працы, накіраванай да зьдзяйсьненьне ідэалаў Акту 25 Сакавіка, і 25 сакавіка памерла.

Валянціна Пашкевіч праз 15 гадоў сыстэматычна вяла беларускую суботнюю школу пры царкве Сьв.Эўфрасіньні Полацкай у Таронта. Апрацавала для сваіх вучняў «Першую чытанку пасьля лемантара для беларускіх дапаўняльных школаў». Валянціна Пашкевіч была таксама аўтаркай ангельскамоўнага падручніку «Беларуская мова — Fundamental Byelorussian» — сыстэмнага курсу беларускай мовы для навучальных мэтаў за межамі Беларусі. Закончыўшы працу над падручнікам, Валянціна Пашкевіч падрыхтавала вялікі (каля 50 000 слоў) «Ангельска-беларускі слоўнік», выданьнем якога заняўся Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў ЗША.

Такая была пілігрымка жыцьця і такую пакінула Валянціна Пашкевіч спадчыну для наступных пакаленьняў. Др.Янка Запруднік, які праводзіць рэдактарскую працу над «Ангельска-беларускім слоўнікам», аснову для якога дала Валянціна, сказаў: «Слоўнік гэты будзе манумэнтам для яе».

Валянціна памерла, але душа яе жыве ў кожным, чыё жыцьцё яна сваім кранула, на каго яна зрабіла ўплыў, хто быў яе вучнем, хто браў зь яе прыклад, хто шанаваў і любіў яе. Жыве яна ў кожнай справе, у якую ўкладала яна свае здольнасьці, сілы, сваю няўтомную працу, сваё сэрца і душу.

Вечная Ёй памяць! А душы Яе вечны супакой!

**Раіса Жук-Грышкевіч, сястра**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Знакамітага навукоўца** Уладзімера Конана сардэчна віншуюць зь юбілеем сябры па Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў! [Адам Мальдзіс, больніца]

**Дарагая Вольця!** Віншую цябе з Днём народзінаў. Жадаю зьдзяйсьненьня ўсіх тваіх мараў. Яўген

**Ігара Пашкевіча** — з Днём народзінаў! Зычу здароўя і шчасьця зычу, зычу каханьня і згоды. Моцы крылам, свабоды шляху, і не сумаваць ніколі! Сястра

**Ігара Пашкевіча** — з Днём народзінаў! Усяго найлепшага! Так трымаць. Сям'я

**Тамара**, сонейка! Зь вясною цябе. Хай усё будзе ў цябе добра. Зьміцер

**Віншуем Зянона** Пазьняка зь юбілеем. Моцнага Вам здароўя. Вы ўзор нацыі. Нізкі Вам паклон. Сям'я з Магілёва

**КАНТАКТЫ**

**Валік!** Калі я ўжо атрымаю свой падарунак на 8 Сакавіка! Табе ня сорамна? Натальля

**Мянчук** (42/170/54) з в/а, бяз шк/зв, пазнаёміцца з жанчынай. Магчыма стварэньне сям'і. А/с 6, 220012, Менск

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Валянціна. Т.: 259-97-80

**Прыхільнікі** Незалежнай Беларусі, патрыёты Беларускай зямлі, адгнукніцеся! Алесь Крывіч, пр.Інтэрнацыянальны, 82а-155, 213410, Горкі

**Кулінковіч**, Вольскі, Паўлаў, падарыце фота са сваімі аўтографамі. Буду ўдзячны. Алесь. Т.: 259-30-84

**Я зноў** буду Вас чакаць у 14.00 ля помніка Калініну. Валера з Жодзіна

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Шырокі выбар CD** беларускіх выканаўцаў у Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13-й

**Часопісы** «ARCHE», «Дзеяслоў», «Спадчына» можна набыць у Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13-й

**Беларускія кнігі** ў Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13-й. Т.: 45-11-51




14 траўня а 18 гадзіне клюб «Рэактар». Квіток — 4 тысячы



**Запрашаем у вандроўкі**



**16 траўня**

**Гомель**

Палац Румянцавых—Паскевічаў (1785—1793).
Ільлінская царква, драўляная, канец XVIII ст.
Паляўнічы домік (пач. XIX ст.).
Парк (канец XVIII — 1-я палова XIX ст.) з пажарнай вежай (канец XVIII — 1-я палова XIX ст.).
Петрапаўлаўскі сабор (1809—1824).
Пахавальня Паскевічаў (1870—1889).
Кошт — 21000 р. для дзяцей і 23000 р. для дарослых.

**23 траўня**

**Браслаў**

Замкавая гара (старажытнае гарадзішча IX ст.).
Драўляны калодзеж XIX ст.
Касьцёл 1824 г.
Царква 1897 г.
Бальніца С.Нарбута (канец XIX — пач. XX ст.).
Сядзібная забудова (1-я трэць XX ст.).
!!!!!!!!!!!! **Фэст «Браслаўскія зарніцы»**
Кошт — 21000 р. для дзяцей і 23000 р. для дарослых.

Тэлефануйце: 222-88-76, 755-03-70;
http://altusplus.narod.ru



**Запрашаем на падарожжа**

**16 траўня** (нядзеля) па маршруце:
**Менск—Смургоні—Сьвір—Засьвір—Шэметава—Лынтупы—Камаі—Паставы—Нарач—Мядзел—Менск.**

**22—23 траўня:**
**Берасьце і наваколье.**

Тэл.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).


**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________

**Імя і прозьвішча** ______________________

**Адрас, тэлефон** ______________________

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Уладзімеру І., Сяргею Ш. зь Менску.** Вашы памфлеты не газэтныя.

**Алесю П. зь Сянна.** Гэтыя Ваш ліст зачыталі на «Свабодзе». Нам няма сэнсу друкаваць тое самае.


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3524. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 21.04.2004.

Замова № 2652.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а